Пятая сесія Вярхоўнага Савета СССР

У Маскве 5 мая пачала работу пятая сесія Вярхоўнага Савета СССР пятага склікання. У 10 гадзін раніцы ў зале пасяджэнняў Вялікага Крамлёўскага палаца і ў памяшканні Крамлёўскага тэатра адбыліся раздзельныя пасяджэнні Савета Саюза і Савета Нацыянальнасцей.

Бурнымі апладысментамі дэпутаты і госці сустрэлі паяўленне ў прэзідыуме кіраўнікоў Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада.

Пасля дакладаў мандатных камісій Палаты прызналі паўнамоцтвы дэпутатаў, выбраных замест выбыўшых дэпутатаў. Затым аднагалосна быў зацверджан наступны парадак дня:

1. Аб адмене падаткаў з рабочых і служачых;
2. Аб мерапрыемствах па завяршэнню пераводу ў 1960 годзе ўсіх рабочых і служачых на скарочаны дзень;
3. Аб зацвярджэнні Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

Затым у Вялікім Крамлёўскім палацы адкрылася сумеснае пасяджэнне Савета Саюза і Савета Нацыянальнасцей.

Бурнымі, працяглымі апладысментамі сустракаецца паяўленне ва ўрадавых ложах кіраўнікоў Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада.

Слова для даклада аб адмене падаткаў з рабочых і служачых даецца Старшыні Савета Міністраў СССР, Першаму сакратару ЦК КПСС дэпутату **М. С. Хрушчову.**

Паяўленне на трыбуне кіраўніка Савецкага ўрада было сустрэта бурнай авацыяй.

Даклад таварыша М. С. Хрушчова выслухоўваецца з велізарнай увагай.

Дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР з аднадушным адабрэннем сустрэлі мерапрыемствы, выкладзеныя ў дакладзе таварыша М. С. Хрушчова. Абмеркаванне даклада вылілася ў яркую дэманстрацыю адзінства партыі і народа.

(ТАСС).

Даклад таварыша М. С. ХРУШЧОВА на сесіі Вярхоўнага Савета СССР

Старшыня Савета Міністраў СССР, Першы сакратар Цэнтральнага Камітэта КПСС дэпутат М. С. Хрушчоў, выступаючы на сесіі Вярхоўнага Савета СССР з дакладам аб адмене падаткаў з рабочых і служачых, падрабязна асвятліў пытанні ўнутранага становішча Савецкай краіны і спыніўся на міжнародных праблемах. Ён сказаў, што Савет Міністраў СССР уносіць на разгляд Вярхоўнага Савета праект Закона аб адмене падаткаў з рабочых і служачых і іншых мерапрыемствах, накіраваных на павышэнне дабрабыту савецкага народа. Другое пытанне — аб мерапрыемствах па завяршэнню пераводу ў 1960 годзе ўсіх рабочых і служачых на скарочаны рабочы дзень.

Кіраўнік Савецкага ўрада падкрэсліў, што парадак дня зусім адпавядае веснавому ўздыму і радасці, адлюстроўвае клопаты нашай партыі і ўрада аб няспынным росце дабрабыту савецкага народа, яшчэ раз пераканальна пацвярджае міралюбны характар палітыкі Савецкай сацыялістычнай дзяржавы.

Закранаючы вынікі мінулага года, М. С. Хрушчоў заявіў, што гэта быў год выдатных дасягненняў у развіцці прадукцыйных сіл, у стварэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма. Мы ніколі за адзін год не рабілі так многа, як у 1959 годзе — першым годзе сямігодкі. Папярэднія вынікі за першыя чатыры месяцы паказваюць, што план другога года сямігодкі паспяхова выконваецца. У ходзе ўсенароднай барацьбы за датэрміновае выкананне нашых планаў набывае ўсё больш шырокі размах выдатны рух брыгад камуністычнай працы, які вылучыў шмат людзей смелай думкі, наватараў вытворчасці, што паказваюць прыклад камуністычных адносін да працы.

Усе народы нашай многанацыянальнай Радзімы, адзначыў М. С. Хрушчоў, уносяць свой уклад у вялікую справу будаўніцтва камунізма, яшчэ больш умацоўваецца саюз і дружба народаў СССР, іх адзінства і згуртаванасць вакол свайго авангарда — Камуністычнай партыі.

Старшыня Савета Міністраў СССР падкрэсліў, што на аснове рашэнняў XX і XXI з'ездаў Камуністычная партыя няўхільна ажыццяўляе праграму ўздыму дабрабыту і культуры савецкага народа. Ён адзначыў, што на аснове росту нацыянальнага даходу ў СССР значна павялічылася рэальная заработная плата рабочых і служачых, павысіліся рэальныя даходы сялян.

Таварыш М. С. Хрушчоў сказаў, што па заданню Цэнтральнага Камітэта партыі і Савецкага ўрада нашы планавыя органы распрацоўваюць план эканамічнага і культурнага развіцця краіны на бліжэйшыя 20 год, які адкрывае перспектывы нябачана хуткага руху краіны па шляху да камунізма. У нас ёсць усе ўмовы для таго, каб у бліжэйшы час савецкі народ пачаў жыць яшчэ лепш, яшчэ багацей і больш радасна.

Сярод мерапрыемстваў, накіраваных на далейшае паслядоўнае павышэнне дабрабыту савецкіх людзей, важнае месца займае адмена ўтрымання падаткаў з насельніцтва. Гэта буйнае мерапрыемства, якое мае вялікае эканамічнае і палітычнае значэнне.

Вызваленне ад падаткаў — даўняя мара працоўных. Але ці можа яна ажыццявіцца ва ўмовах капіталізму? — гаворыць таварыш Хрушчоў. — Вядома, не, — адказвае ён. Адна з характэрных рысаў капіталізму на ўсіх этапах яго развіцця — нястрымны рост падаткаў з насельніцтва. Асабліва ўзраслі падаткі ў эпоху імперыялізму ў сувязі з велізарным ростам ваенных выдаткаў і разбуханнем дзяржаўнага апарату.

У сучасных умовах, дзякуючы дасягнутым поспехам у развіцці эканомікі, умацаванню фінансаў і грашовага абарачэння Савецкі Саюз мае неабходныя рэсурсы для таго, каб ужо ў гэтым годзе прыступіць да адмены падаткаў з заработнай платы рабочых і служачых. Унесены на абмеркаванне Вярхоўнага Савета праект Закона прадугледжвае ажыццявіць адмену падаткаў па этапах, пачаць яе ўжо ў гэтым годзе і закончыць у 1965 годзе. Прычым маецца на ўвазе пачаць адмену падаткаў у першую чаргу з рабочых і служачых з адносна меншымі заработкамі, а затым паступова спыніць утрыманне падаткаў з усіх рабочых і служачых.



Масква. 5 мая 1960 года. Пятая сесія Вярхоўнага Савета СССР. На трыбуне — Старшыня Савета Міністраў СССР, Першы сакратар ЦК КПСС таварыш **М. С. ХРУШЧОЎ.**

Фота **В. Савасцьянава** і **В. Собалева.** Фотахроніка ТАСС.

Даходы рабочых і служачых у выніку поўнай адмены падаткаў узрастуць да 1966 года прыкладна на 74 мільярды рублёў у год. Гэта з'явіцца важнай дадатковай мерай, накіраванай на далейшае павышэнне дабрабыту народа.

Таварыш М. С. Хрушчоў падрабязна гаварыў аб тым, як мяркуецца правесці ў жыццё адмену падаткаў. Ён адзначыў, што сельскагаспадарчы падатак часова варта захаваць, паколькі ён адыгрывае пэўную ролю ва ўмацаванні працоўнай дысцыпліны калгаса і ў рэгуляванні даходаў калгаснікаў ад асабістай падсобнай гаспадаркі. З цягам часу наспеюць умовы для адмены і сельскагаспадарчага падатку.

Вялікую ўвагу ў сваім дакладзе М. С. Хрушчоў аддаў задачам павышэння прадукцыйнасці працы і зніжэння сабекошту прадукцыі. Ён указаў, што ва ўмовах сацыялізма змагацца за лепшае жыццё — гэта значыць, перш за ўсё, змагацца за павышэнне прадукцыйнасці працы. Толькі праца стварае матэрыяльныя і духоўныя багацці, пераўтварае і ўпрыгожвае зямлю. Толькі праца вядзе да поўнай і канчатковай перамогі новага грамадскага ладу.

Адначасова з разглядам пытання аб адмене падаткаў з насельніцтва, працягваў М. С. Хрушчоў, прапануецца абмеркаваць і вырашыць на сесіі Вярхоўнага Савета яшчэ адно буйнае пытанне нашай фінансавай палітыкі — аб мэтазгоднасці ўмацавання савецкай грашовай адзінкі шляхам змены існуючага маштабу цэн.

Таварыш Хрушчоў сказаў, што калі да Вялікай Айчыннай вайны аб'ём валавой прадукцыі, тавараабароту, фонд заработнай платы вылічваўся ў мільярдах і дзесятках мільярдаў рублёў, дык цяпер гэтыя паказчыкі вызначаюцца ў сотнях мільярдаў і трыльёнах рублёў. У гэтых умовах стала неабходным узбуйніць нашу грашовую адзінку, павялічыць залатое ўтрыманне рубля і пераглядзець маштаб цэн.

Савет Міністраў СССР разгледзеў гэтае пытанне і прыняў рашэнне павысіць з пачатку 1961 года маштаб нашай грашовай адзінкі ў 10 разоў і ў сувязі з гэтым выпусціць у абарачэнне новыя грошы. Гэтае мерапрыемства не выкліча ніякіх страт ні з боку насельніцтва, ні з боку дзяржавы. Узбуйненне грашовай адзінкі азначае зніжэнне ў 10 разоў супраць цяперашняга ўзроўню ўсіх аптовых закупачных і рознічных цэн, а таксама платы за ўсе паслугі, што прадастаўляюцца насельніцтву: платы за кватэру і камунальныя паслугі, за праезд на ўсіх відах транспарту, за паслугі сувязі, за наведанне тэатраў, кіно і г. д.

Адначасова будуць пералічаны па гэтых суадносінах, — г. зн. 10 да 1 — усе грашовыя даходы насельніцтва, якія яно атрымлівае ад дзяржавы, дзяржаўных і кааператыўных прадпрыемстваў, арганізацый і калгасаў у выглядзе заработнай платы, заработкаў калгаснікаў, пенсій, дапамог, стыпендый і г. д.

У мэтах стварэння зручнасцей насельніцтву для абмену будзе ўстаноўлены дастатковы тэрмін — тры месяцы. На працягу гэтага часу ўсе грамадзяне СССР змогуць спакойна абмяняць свае грошы. У гэты перыяд у абарачэнні будуць знаходзіцца новыя і старыя грошы: пры гэтым старыя грошы будуць прымацца ў плацяжы за тавары і паслугі ў суадносінах 10 рублёў старымі грашыма за адзін рубель новымі. Гэта дазволіць усяму насельніцтву цалкам абмяняць, без усякіх абмежаванняў, усе наяўныя ў яго грашовыя білеты і разменную манету ў тэрміны, зручныя для ўсяго насельніцтва краіны. У такіх жа суадносінах павінны быць пералічаны ўсе зберажэнні насельніцтва.

Намечаныя мерапрыемствы праводзяцца ва ўмовах вялікага эканамічнага ўздыму, трывалага грашовага абарачэння і з'яўляюцца вынікам дасягнутых поспехаў у будаўніцтве камуністычнага грамадства.

Спыняючыся затым на пытаннях усямернага пашырэння вытворчасці тавараў народнага ўжытку, таварыш Хрушчоў сказаў, што Цэнтральны Камітэт КПСС і Савет Міністраў СССР даручылі Дзяржплану падрыхтаваць канкрэтныя мерапрыемствы па далейшаму пашырэнню вытворчасці і павелічэнню выпуску тканін, абутку і іншых тавараў з тым, каб у больш кароткія тэрміны пераўзыйсці ўзровень ужытку гэтых тавараў у Злучаных Штатах Амерыкі.

Усе праведзеныя намі мерапрыемствы і намечаныя новыя планы, сказаў таварыш Хрушчоў, выгадна адрозніваюць наш сацыяльны лад, нашу савецкую сістэму ад ладу капіталістычнага. На справе, на фактах самога жыцця, сваёй працай, сваімі поспехамі, самой практыкай мы абвяргаем хлусню буржуазных палітыкаў і філосафаў, што капіталізм забяспечвае самы высокі ўзровень жыцця народа.

Заключную частку даклада Старшыня Савета Міністраў СССР прысвяціў прадстаячай нарадзе кіраўнікоў урадаў у Жэневе. Ён сказаў, што кіраўнікам чатырох дзяржаў — Савецкага Саюза, Злучаных Штатаў Амерыкі, Вялікабрытаніі і Францыі прадстаіць разгледзець важнейшыя міжнародныя пытанні, вырашэнне якіх пажадана і больш таго неабходна для таго, каб закласці трывалыя асновы міру і забяспечыць мірнае суіснаванне дзяржаў з розным сацыяльным ладам. Паспяховы разгляд гэтых пытанняў на прадстаячай нарадзе ў вярхах прывёў бы да паляпшэння адносін паміж краінамі, усяліў бы ў народы ўпэўненасць, што сілы міру бяруць верх над сіламі вайны і, значыць, былі б расчышчаны шляхі для развіцця палітыкі, накіраванай на ўмацаванне міру і дружбы паміж народамі.

У ліку гэтых пытанняў, указаў М. С. Хрушчоў,—усеагульнае і поўнае раззбраенне, заключэнне мірнага дагавору з Германіяй і вырашэнне на гэтай аснове пытання аб заходнім Берліне.

Кіраўнік Савецкага ўрада заявіў, што складаецца ўражанне, што пэўныя кіруючыя колы Злучаных Штатаў Амерыкі цяпер яшчэ не прыйшлі да выводу аб неабходнасці змякчэння напружанасці і вырашэння спрэчных пытанняў шляхам перагавораў. За апошні час прыкметна актывізаваліся ў Злучаных Штатах Амерыкі ўплывовыя ўнутраныя сілы—імперыялістычныя колы, мілітарысты. Гэтыя агрэсіўныя сілы стаяць на пазіцыях прадаўжэння «халоднай вайны», гонкі ўзбраення і ідуць нават на прамыя правакацыі.

Па даручэнню Савецкага ўрада М. С. Хрушчоў паведаміў Вярхоўнаму Савету аб агрэсіўных дзеяннях, якія мелі месца за апошнія тыдні з боку Злучаных Штатаў Амерыкі супраць Савецкага Саюза. Гэтыя агрэсіўныя дзеянні выразіліся ў тым, што Злучаныя Штаты Амерыкі пасылалі свае самалёты, якія перасякалі нашы дзяржаўныя граніцы і ўтаргаліся ў межы Савецкага Саюза. Амерыканскі самалёт, які ўторгся на нашу тэрыторыю 1 мая, быў збіты.

Як трэба ацэньваць такія дзеянні агрэсіўных колаў Злучаных Штатаў Амерыкі?—пытаецца М. С. Хрушчоў. Бо 16 мая на нарадзе кіраўнікоў урадаў мы павінны сустрэцца з прэзідэнтам Злучаных Штатаў Амерыкі Эйзенхаўэрам, а за два тыдні да гэтага ваенна-паветраныя сілы ЗША прадпрынялі агрэсіўны акт у адносінах Савецкага Саюза.

Мы можам сказаць панам, якія пасылалі гэты самалёт, што іх спробы сагнуць нашы калені і нашу спіну шляхам націску не могуць на нас падзейнічаць, заявіў М. С. Хрушчоў. Савецкі Саюз мае магчымасці для таго, каб даць адпор усім, хто захоча шляхам націску дамагчыся рашэння, выгаднага для агрэсара.

Мы ідзём на нараду ў Парыжы, падкрэсліў М. С. Хрушчоў, з чыстым сэрцам, добрымі намерамі і не пашкадуем сіл, каб дасягнуць узаемна-прыймальнага пагаднення. Але мы павінны цвяроза ацэньваць магчымасці і бачыць, што ёсць прыкметы, якія прадвяшчаюць, што гэтыя перагаворы могуць не задаволіць спадзяванняў народаў усяго свету, якія імкнуцца жыць у міры.

Заканчваючы даклад, М. С. Хрушчоў заявіў:

— Імперыялісты не ў сілах затармазіць развіццё сацыялістычных краін, якія ўпэўнена ідуць да светлай будучыні чалавецтва—да камунізма.

Можна з упэўненасцю сказаць, што пытанні, якія будзе абмяркоўваць Вярхоўны Савет, выклічуць пачуцці высокага гонару ва ўсіх савецкіх людзей. Яшчэ і яшчэ раз кожны савецкі чалавек скажа сабе: так, не дарэмна былі патрачаны гады; воля і праца сапраўды стварылі цудоўныя дзівы на савецкай зямлі.

Пад сцягам Леніна, пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі да новых перамог у будаўніцтве камунізма!

Даклад М. С. Хрушчова неаднаразова перапыняўся бурнымі апладысментамі.

(ТАСС).

У ЦК КПСС і Савеце Міністраў СССР

ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР пастанавілі павысіць з пачатку 1961 года пакупную сілу грашовай адзінкі ў 10 разоў, а таксама павысіць залатое ўтрыманне рубля і курс рубля да замежных валют.

У сувязі з гэтым з 1 студзеня 1961 года будуць выпушчаны новыя грошы, а грошы старога ўзору, якія знаходзяцца цяпер у абарачэнні, павінны быць заменены новымі грашыма, выходзячы з суадносін 1 рубель новымі грашыма за 10 рублёў старых грошай. Адначасова па такіх жа суадносінах будуць пералічаны ўсе цэны на тавары, тарыфы на паслугі, заработная плата і іншыя даходы насельніцтва, а таксама зберажэнні насельніцтва. Будуць адпаведна паменшаны плацяжы насельніцтва дзяржаве.

Пры новых цэнах насельніцтва за сваю заработную плату і іншыя даходы здолее набываць такую ж колькасць тавараў, колькі набывала раней. Насельніцтва будзе таксама мець магчымасць аплачваць такую ж колькасць паслуг камунальных, транспартных, відовішчных і іншых прадпрыемстваў і арганізацый, як і да змены маштабу цэн.

Такім чынам правядзенне гэтага мерапрыемства не выкліча страт ні ў насельніцтва, ні ў дзяржавы.

Установы Дзяржбанка на працягу першага квартала будуць бесперашкодна і без усялякіх абмежаванняў праводзіць абмен грашовых білетаў і металічнай манеты старога ўзору на новыя грошы. Для гэтай мэты будуць арганізаваны спецыяльныя абменныя пункты Дзяржбанка.

У адпаведнасці з новым курсам рубля будзе пералічана запазычанасць замежных дзяржаў па крэдытах, прадстаўленых Савецкім Саюзам. Гэты пералік будзе зроблены без страт для СССР і замежных дзяржаў.

ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР, надаючы вялікае значэнне мерапрыемствам, якія праводзяцца, па далейшаму ўдасканаленню савецкай грашовай сістэмы, лічаць, што гэтыя мерапрыемствы будуць садзейнічаць далейшаму ўмацаванню гаспадарчага разліку, яшчэ большаму ўкараненню беражлівасці ва ўсёй гаспадарчай дзейнасці, павышэнню пакупной здольнасці савецкага рубля і тым самым далейшаму развіццю сацыялістычнай эканомікі нашай краіны.

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 37 (1466) | Субота, 7 мая 1960 года | Цана 40 кап.

МАЙ—МЕСЯЦ АСАБЛІВЫ

У Маскве, у Крамлі, праходзіць пятая сесія Вярхоўнага Савета СССР. У гэтыя майскія дні савецкія людзі з вялікай цікавасцю сочаць за работай Вярхоўнага Савета, які вырашае важныя, хвалюючыя пытанні.

Май — месяц асаблівы не толькі ў прыродзе, але і ў жыцці народаў. І хоць пакуль ён яшчэ не аблашчыў ні цяплом, ні святлом, кожны ведае, што цяпло будзе, што зіхотлівае майскае сонца вырыне з-за хмар і ліне святло і цеплыню на пазеляненую маладую зямлю; кожны ведае, што ў маі абавязкова зацвітуць сады, выб'ецца з зямлі маладая шчэць руні, зацвітуць на лугах і на клумбах кветкі; забуяе маладое жыццё ўсюды, усюды.

Май у жыцці народаў месяц асаблівы яшчэ і таму, што ў ім, ці то па шчаслівай выпадковасці, ці па якой заканамернасці адбываліся і маюць адбыцца такія падзеі, якія становяцца рубяжом гісторыі. І не выпадкова ён стаў месяцам салідарнасці народаў, месяцам шчаслівых надзей і парываннняў... Для нас, савецкіх людзей, май асаблівы і тым, што пятнаццаць год таму назад нашы воіны ўзнялі чырвоны штандар перамогі над самым драпежным, самым лютым ворагам чалавецтва — фашызмам. І хоць за гэтыя пятнаццаць год зарубцаваліся, зажылі крывавыя раны, якія пакінуў на целе нашай роднай зямлі фашызм, у памяці народнай яны і сёння, як жывыя. Няхай ужо вырасла маладое пакаленне, якое вельмі цьмяна ўяўляе сабе вайну, яе жахі, але, будуючы камунізм, і ветэраны мінулай вайны, і іх дзеці і ўнукі ні на момант не могуць забыць, што такое вайна, бо яшчэ і цяпер амаль у кожнай сям'і крываточыць нанесеная ёй рана; у адну сям'ю не вярнуўся кармілец бацька, і дзецям самім давялося расці і выхоўвацца, у другой на сценах ці ў альбомах між сямейных фотаздымкаў захоўваецца картка любімага сына ў вайсковай форме і кожны раз маці, як толькі зірне на гэтую картку, не можа стрымаць слёз.

У нашага народа не кароткая памяць, і хоць мы на руінах і папялішчах вайны ўзвысілі новыя гарады і сёлы, якія сёння іскрацца весялосцю і радасцю, хоць мы не толькі адналі сваю народную гаспадарку, але і далёка-далёка пераўзыйшлі даваенны ўзровень ва ўсіх галінах вытворчасці, навукі і тэхнікі, культуры і мастацтва, савецкія людзі ніколі не забудуць таго, што нарабіў фашызм, што прынесла ім страшэнная вайна.

Адзначаючы пятнаццацігоддзе перамогі над гітлераўскай Германіяй, мы сёння пільна ўглядваемся ў будучыню: а ці не відаць там дзе тых хмар, якія нясуць ваенныя ліўні. Кожны савецкі чалавек жыве імкненнем да міру. Нездарма мы так адзінадушны ў барацьбе за гэтую вялікую мэту сучаснасці. Наша Камуністычная партыя, наш Савецкі ўрад робяць усё для таго, каб на далягляддзе часу не ўзніклі злавесныя хмары вайны. Імя Старшыні Савета Міністраў СССР Мікіты Сяргеевіча Хрушчова ва ўсім свеце вымаўляецца поруч са святым і жаданым словам «мір». Яго падарожжы ў Злучаныя Штаты Амерыкі, у краіны Азіі, яго нядаўні візіт у Францыю паказалі ўсім простым людзям свету чаго хочуць, чаго дамагаюцца савецкія людзі. Яны хочуць міру і толькі міру ў імя росквіту жыцця на зямлі, дзеля шчасця народаў. Яны хочуць міру дзеля таго, каб яшчэ больш паспяхова ажыццяўляць светлую мару чалавецтва — камунізм.

Нядаўна народы нашай краіны, працоўныя ўсяго свету адзначалі дзевяностагоддзе з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна, стваральніка і арганізатара Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы. Жыццё паказала невымерную глыбіню ленінскіх ідэй, іх выключную жыццёвасць, іх вялікую праўду. Будуючы жыццё па-ленінску, ажыццяўляючы ленінскае вучэнне наша краіна з адсталай і занядбанай менш чым за паўстагоддзе ператварылася ў перадавую краіну свету. Нашы спадарожнікі, нашы ракеты першымі праклалі дарогу ў касмічныя прасторы. Ды хіба толькі гэтае. Наша навука, нашы літаратура і мастацтва пракладваюць дарогу чалавецтву ў светлую яго будучыню, бо яны жывяцца і кіруюцца самай перадавой ідэалогіяй, яны грунтуюцца на марксісцка-ленінскім вучэнні, якое не мела і не мае сабе роўных па глыбіні пазнання законаў развіцця не толькі грамадства, але і самой прыроды.

У ленінскія дні была абнародавана пастанова Камітэта па прысуджэнню Ленінскіх прэмій выдатным дзеячам навукі, культуры, практыкі камуністычнага будаўніцтва. Кожная з работ, удастоеных прэміі Ільіча — гэта найвялікшы ўклад у скарбніцу ўсяго чалавецтва. Мы, савецкія пісьменнікі, ганарымся тым, што ў сям'і лаўрэатаў прэміі Леніна пачэснае месца занялі і нашы сабраты па пяру — найталенавіты рускі пісьменнік Міхаіл Шолахаў, украінскі паэт Максім Рыльскі, Мірзо Турсун-задэ. Прысуджэнне Ленінскіх прэмій за творы літаратуры і мастацтва — гэта прызнанне іх найвялікшай ролі ў справе камуністычнага выхавання савецкага чалавека.

Гэтымі днямі апублікавана пастанова Камітэта па Ленінскіх прэміях «За ўмацаванне міру паміж народамі». Высокага звання Ленінскіх лаўрэатаў удастоены прэзідэнт рэспублікі Інданезіі доктар Сукарна, грамадскі дзеяч ЗША Сайрус Ітан, грамадскі дзеяч Францыі Ларан Казанова, грамадскі дзеяч Іракскай рэспублікі Азіз Шэрыф і наш савецкі драматург і выдатны грамадскі дзеяч Аляксандр Карняйчук. Прысуджэнне Ленінскіх прэмій «За ўмацаванне міру паміж народамі» людзям розных палітычных і ідэалагічных поглядаў — яскравейшы доказ таго, як наша краіна, як і ўсе народы свету, зацікаўлена ва ўмацаванні міру на зямлі. Аб гэтым вельмі выразна і красамоўна сказаў Сайрус Ітан: «Я глыбока цаню гэты высокі гонар. Аказанне яго капіталісту дае новы рашучы доказ таго, у чым я ўпэўнены, — шчырай зацікаўленасці савецкага народа і яго ўрада ў міры для ўсяго чалавецтва».

Імёны мір для ўсяго чалавецтва— гэта аснова асноў палітыкі нашага Савецкага ўрада, гэта тое, за што змагаецца ўвесь наш народ. У імя гэтай мэты нашы савецкія воіны пятнаццаць год таму назад узнялі сцяг перамогі над рэйхстагам.

Сёлетні месяц май асаблівы і тым, што ён нясе народам свету вялікую надзею на мір, бо ў гэтым месяцы ў Парыжы збяруцца главы ўрадаў чатырох вялікіх дзяржаў на сваю гістарычную сустрэчу, на якую гэтак многа ўскладаюць надзей народы ўсяго свету. Мы ўсе ўпэўнены, што наступіць пацяпленне не толькі ў прыродзе, але і што пасля нарады канчаткова растануць крыгі «халоднай вайны». Няхай як там ні шалеюць прыхільнікі яе, усё роўна свет стаіць напярэдадні таго, калі небасхіл канчаткова ачысціцца ад чорнай наваличы хмар, калі ў ясным блакіце жыцця будзе свяціць зіхотлівае сонца міру. У імя гэтага працуе, дзярэае, творыць савецкі народ, у імя гэтага працуе яго ўрад і перш за ўсё вялікі і шчыры пасланец міру, яго вястун і змагар за яго Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў. Вось чаму сёлетні май — месяц асаблівы, месяц надзей, месяц міру і росквіту жыцця.

Раман САБАЛЕНКА.

ПЕСНІ ГЕРОЯЎ НЕЎМІРУЧЫЯ

Другая палова 20-х гадоў. Малады спявак з эстрады, са сцэны рабочага клуба, у вёсках Падмаскоўя натхнёна спявае першыя песні першых савецкіх кампазітараў Давыдзенкі, Шэхтэра, Каваля, Кабалеўскага.

І многія памятаюць яшчэ сёння, як самааддана спяваў ён «Арлёнка».

Спявак першым выконвае з эстрады песню «Широка страна моя родная», і ўся зала, захопленая выдатным майстэрствам артыста, падхоплівае песню.

...І вось ён стаіць на вяршыні кургана, босы, у сподняй кашулі. Сцюдзёны лютаўскі вецер коціць яму пад ногі хвалі ледзянога снегу. Побач з ім яго таварыш, таленавіты хармайстар Г. Лузенін. Узнялі аўтаматы гітлераўцы. Нечакана яго магутны голас загучаў у пералеску. Ён спяваў «Арлёнка», ён верыў, што беларускі вецер данясе да любімай Масквы расказ пра тое, «як сына вялі на расстрэл». Кат-афіцэр, раскурваючы сігарэту, усе яшчэ не дае каманды. Ён спадылба глядзіць на гэтых двух рускіх, што стаяць побач.

«Файер!» — гучыць жорсткае слова. Паваліўся спявак, паваліўся яго таварыш, адзін з таленавітых хармайстраў краіны, чалавек, які першы са сваім хорам выканаў у Маскве вядомую кантату Пракоф'ева «Уставайце, людзі рускія».

Так закончыўся іх слаўны шлях творчасці і барацьбы. Ішлі гады. Даўно ўжо адгрымелі баі. Бязлітасны час імкнуўся сцерці з памяці народнай імёны загінуўшых герояў. На працягу дзесяці год, крупінка за крупінкаю збіраліся звесткі аб подзвігу многіх герояў мінулай вайны, аб подзвігу маскоўскіх артыстаў А. Акаёмава і Г. Лузеніна, расстраляных гітлераўцамі ў крычаўскім канцлагеры.

* * *

...Акаёмаў і Лузенін, знясіленыя, блукалі па лагеры. Яны пазнаёміліся з мясцовым жыхаром, старым інжынерам Кошалевым, які іншы раз падыходзіў да лагера разам з жонкаю. Па іх просьбе Кошалеў звярнуўся да мясцовага папа, які шукаў харыстаў, каб ён паручыўся за артыстаў. Так трапілі яны на агульныя работы ў горад Крычаў. Шэсць дзён трэба пілаваць дровы ў бальніцы, вазіць ваду, везціць па дровы, падаваць бялізну тыфозных хворых у дызенфекцыйную камеру, а ў нядзелю спяваць у царкоўным хоры. Харчаванне — як і ўсім рабочым з ваеннапалонных — хлеб з аўсянай мукі, пілавіння і жалудоў.

У лагеры артысты па дамоўленасці з таварышамі, якія працавалі побач, псавалі станкі ў механічнай майстэрні, клалі ў сцены бітую цэглу, выносілі і закідвалі ў лужыны каштоўныя невялікія часткі механізмаў. Немцы, якім дазарэзу патрэбен быў крычаўскі цамент для будаўніцтва ўмацаванняў, расстрэльвалі палонных партыямі, але так і не пусцілі ў ход завод.

У Крычаве артысты не адразу знайшлі шлях да падпольнай арганізацыі. Але яны бачылі наклееныя на парканах лістоўкі, напісаныя ад рукі, чулі расказы пра першых партызан. Сядзець, склаўшы рукі, яны не маглі. Неяк да іх падыйшоў пятнаццацігадовы Шурык Карагодаў і так, каб ніхто не бачыў, паказаў першамайскую лістоўку, скінутую савецкімі самалётамі. Артысты, якія добра ведалі хлопца, схавалі лістоўку і паказалі хлопчыку лістоўку з іншым тэкстам. А пасля гэтыя лістоўкі былі перапісаны ад рукі і раскіданы па Крычаву. Жанчыны, якія прыходзілі ў царкву з дальніх вёсак, разнеслі іх па ўсяму раёну.

Даволі хутка сышліся артысты з ваеннапалонным Мікалаем Кулішавым. Кулішаў, прыглядзеўшыся да артыстаў, пазнаёміў іх з камуністам, жыхаром Крычава Мацвеем Каінавым, кіраўніком падпольнай групы. Хутка Акаёмаў, Лузенін і Кулішаў ужо былі цесна звязаны з бясстрашнай партызанскай разведчыцай, членам Крычаўскага падпольнага райкома камсамола Марыяй Таўкачовай. Марыя працавала бухгалтарам у камендатуры і здабывала каштоўныя разведвальныя дадзеныя, якія перадавала ў лес, сакратару падпольнага райкома партыі Кузьму Андрэевічу Рэвуцкаму.

Гітлераўцы і здраднікі з ног збіліся, шукаючы сляды падпольнай арганізацыі, пра дзейнасць якой у іх было шмат дадзеных. Яны прыглядаліся і да артыстаў. Але масквічы паводзілі сябе асцярожна. Яны арганізавалі народны хор. Спяваў хор выдатна. Праходзіў канцэрт у адной з самых вялікіх залаў горада. Акаёмаў спляваў рускія народныя песні. І як спяваў! Здавалася, уся душа спевака пела з маленства дарагія словы і напевы. Вось ён спявае «Из-за острова на стрежень». І нечакана пауза, вялікая працяглая. Замерла зала. Што здарылася з Аляксандрам Іванавічам, няўжо ён забыў словы? Чаму ж Лузенін, які

(Заканчэнне на 4-й стар.)

ГЭТА БЫЛО НЕ ТАК ДАЎНО

«Згодна плану, прадугледжваецца высяленне 75 працэнтаў беларускага насельніцтва з займаемай ім тэрыторыі. Значыць, 25 працэнтаў беларусаў па плану галоўнага ўпраўлення імперскай бяспекі падлягае анямечванню...»

З апублікаваных дакументаў аб гітлераўскім плане «Ост».

Дык вось што з табою хацелі зрабіць,
Любоў мая, гордасць і вера!..
Аб гэтым патомкаў прашу не забыць
На сто пакаленняў уперад.

Які нечуваны чакаў прыгавор!
Прымусіўшы гвалту скарыцца,
Тры чвэрці адправіць на голад і мор,
А рэшту — хрысціць у арыйцаў.

Тры чвэрці адправіць за тысячы вёрст
Ад гоняў, дзе й вецер быў родны,
Каб нават памерці да дзедаўскіх гнёзд
Вярнуцца не мог аніводны.

А рэшту пакінуць, каб неслі крыжы,
Каб самі магілу капалі
Для скарбаў тваёй неўміручай душы,
Для сонечных песень Купалы;

Каб сёння, праз дваццаць гадоў усяго —
Нявольнік і раб на Радзіме —
Не мог я маленькага сына свайго
Па продку назваць нашым імем.

Паганаю, чорнай варожай крывёй
Быў план перакрэслен вар'яцкі!
У сховах зямлі шматпакутнай тваёй
Іх дух датлявае ваяцкі.

Гніюць-дагніваюць таго касцякі,
Хто прагнуў знайсці тут прастору.
Табе ж уздымаць пераможна сцягі —
Чым далей, тым вышай угору.

На вечныя векі ты — сам гаспадар
Прасторaў сваёй Беларусі.
Ніколі не стане твой лёс пад удар,
Пакуль ты ў братэрскім Саюзе.

Ніл ГІЛЕВІЧ.

Хвалі служаць чалавеку

Чуецца гул матораў — уражанне такое, што вельмі нізка спусціўся самалёт і вось-вось павінен праляцець над домам. Хочацца кінуцца да акна і паглядзець на яго... Але той, хто не ўпершыню ў лабараторыі акустыкі Мінскага радыёзавода, ведае, што гэта выпрабаванне ўзмацняльніка стэрэафанічнага гуказапісу.

Цяпер канструктарскае бюро завода распрацоўвае многа цікавых канструкцый, у тым ліку і стэрэафанічную радыёлу.

Нягледзячы на высокую якасць гучання звычайных прыёмнікаў, слухаючы іх, рэдка складваецца ўражанне, што перад вамі аркестр або хор, таму што гукі выходзяць як бы з аднаго пункта.

Музыканты ўжо даўно звярталі на гэта ўвагу канструктараў. Яшчэ ў 30-х гадах вядомы дырыжор Леапольд Стакоўскі прымяняў для трансляцыі сімфанічных канцэртаў некалькі асобных мікрафонаў, размешчаных у розных месцах залы. У другой зале такім жа чынам размяшчаліся гучнагаварыцелі і складалася ўражанне, што перад вамі сімфанічны аркестр. Прысутныя маглі дакладна паказаць, дзе «знаходзіцца» той або іншы музыкальны інструмент.

Такі ж прынцып выкарыстан і ў стэрэафанічным радыёвяшчанні, якое хутка пачне прымяняцца ў нашай краіне.

За 65 год існавання радыётэхніка дасягнула ў нас вялікіх поспехаў. Калі ў першыя гады Савецкай улады Уладзімір Ільіч Ленін мог толькі марыць аб газеце без паперы і адлегласцей, марыць пра той час, калі ў любым месцы Расіі можна будзе слухаць перадачу з Масквы, то сёння голас маскоўскага дыктара стаў родным і блізкім у самых далёкіх кутках нашай Радзімы. Расказваючы праўду аб краіне Саветаў, гэты ж голас чуваць і за мяжой, бо для радыёхваль няма дзяржаўных граніц.

Хутка з дапамогай радыё ва ўсім Савецкім Саюзе можна будзе не толькі слухаць маскоўскія перадачы, але і бачыць тое, што адбываецца ў сталіцы. Перадача тэлевізійных праграм на вялікія адлегласці наблізіць сталічныя тэатры і канцэртныя залы да самых далёкіх куткоў краіны.

Сямігадовы план прадугледжвае развіццё шырокай сеткі радыёрэлейных ліній, з дапамогай якіх можна будзе абменьвацца тэлевізійнымі перадачамі паміж рознымі гарадамі. Ужо ў гэтым годзе першамайскі парад на Краснай плошчы бачылі тэлегледачы Кіева, Харкава, Растова-на-Дану і іншых гарадоў. А хутка ўвойдзе ў эксплуатацыю радыёрэлейная лінія Масква—Смаленск—Мінск. Гэта дазволіць наладзіць рэгулярны абмен перадачамі паміж Цэнтральнай і Мінскай студыямі тэлебачання.

Радыё з'яўляецца не толькі сродкам сувязі. Яшчэ стваральнік радыё А. С. Папоў гаварыў аб магчымасці выкарыстання радыёхваль для кіравання разнастайнымі працэсамі на адлегласці, і гэта шырока выкарыстоўваецца ў нашы дні пры аўтаматызацыі вытворчасці, у будаўніцтве аўтаматычных метэаралагічных станцый і г. д.

Радыётэхнічныя метады трывала ўвайшлі ў практыку навуковых даследаванняў: у радыёастраноміі яны дазваляюць даведвацца аб уласцівасцях касмічнай прасторы, у радыёспектраскапіі — даследваць атамы і малекулы.

Створаныя на базе развіцця электронікі і радыётэхнікі электронныя вылічальныя машыны з вялікай хуткасцю дазваляюць рабіць складаныя разлікі. Гэта не толькі вызваляе людзей ад клапатлівай разумовай працы, але і дазваляе ставіць перад канструктарамі канкрэтныя задачы, вырашэнне якіх не было раней магчымым з-за вялікай колькасці разлікаў.

За гады Савецкай улады ў нашай рэспубліцы створана сучасная радыётэхнічная прамысловасць. Добрай славай карыстаюцца прыёмнікі і тэлевізары Мінскага радыёзавода. Нядаўна пачаўся выпуск новай радыёлы першага класа «Беларусь-59», якая заслужыла высокую ацэнку спецыялістаў. З'явіліся ў продажы тэлевізар «Нёман» і эканамічны батарэйны прыёмнік на поўправадніках «Мінск-Т». Беларускія канструктары распрацоўваюць цяпер тэлевізар «Беларусь-110», у якім, дзякуючы выкарыстанню новага тыпу электроннай трубкі, вялікі экран будзе спалучацца з невялікімі знешнімі памерамі. Вядуцца работы над стварэннем кішэннага прыёмніка на поўправадніках і іншых канструкцый.

У рэспубліцы выпускаецца і распрацоўваецца многа разнастайнай радыёапаратуры.

У перадмайскія дні калектыў Мінскага радыёзавода дасягнуў выдатных поспехаў, заваяваўшы пераходныя чырвоныя сцягі Савета Міністраў БССР, Мінскага гаркома і Варашылаўскага райкома партыі.

Выкарыстоўваючы сучасныя дасягненні навукі, радысты Беларусі павінны распрацаваць і выпусціць за сямігодку рад новых складаных прыбораў для насельніцтва і разнастайных галін народнай гаспадаркі.

С. ШУШКЕВІЧ,
інжынер.

У гонар юбілею кампазітара

Сёння спаўняецца 120 год з дня нараджэння выдатнага рускага кампазітара П. І. Чайкоўскага.

У гонар гэтай знамянальнай даты Тэатр оперы і балету паказаў 6 мая працоўным сталіцы неўміручы твор кампазітара — балет «Лебядзінае возера». Партыі Адэты-Адыліі выканала заслужаная артыстка Таджыкскай ССР І. Савельева, партыю Зігфрыда — заслужаны артыст БССР В. Міронаў, партыю Ротбарта — Я. Карпаў, Блазна—заслужаны артыст БССР Г. Мартынаў. Дырыжыраваў І. Абраміс.

Выстаўка твораў маладых мастакоў

Студэнты Мінскага мастацкага вучылішча, рыхтуючыся да 15-й гадавіны перамогі савецкага народа над нямецкім фашызмам, наладзілі выстаўку сваіх работ. Сярод іх дыпломныя кампазіцыі, зробленыя маслам, нацюрморты, графіка, арнаменты. Гэтыя работы будуць экспанавацца на гарадской выстаўцы сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Наведвальнікі выстаўкі пазнаёмяцца з цікавай работай Ул. Рамейкі «Весткі з Петраграда», карцінай «Адпачынак маракоў на эсмінцы» Б. Ермачэнкі і інш. Усяго будзе экспанавацца каля 150 работ.

Зм. МАСЛАЎ.

Часопісы ў маі

«ПОЛЫМЯ»

Адкрываецца часопіс нізкай новых вершаў старэйшага беларускага паэта Ул. Дубоўкі — «З падарожжа на Прыпяць». З вялікім цыклам вершаў выступае ў нумары Максім Танк. Некалькі новых вершаў друкуе Сяргей Грахоўскі. Змешчан верш маладой паэтэсы Веры Вярбы.

Пад рубрыкай «З літаратурнай спадчыны» публікуюцца раней нідзе не друкаваныя вершы Якуба Коласа, перададзеныя ў рэдакцыю сынам паэта Д. Міцкевічам.

З празаічных твораў — другая кніга аповесці Рамана Сабаленкі «Юнацтва ў дарозе»; апавяданне Ул. Дамашэвіча «Хараство душы».

«Калі зацвітаюць вішні» — так называецца нарыс Антона Бялевіча, прысвечаны сціплай і гераічнай працы звеннявой калгаса «Перамога» Пружанскага раёна Тасі Кабрынец.

У раздзеле «Публіцыстыка» змешчаны тры памфлеты ўкраінскага пісьменніка Юрыя Мельнічука пра некаторых прафашысцкіх недабіткаў, буржуазных нацыяналістаў, што «праславіліся» сваёй дзейнасцю на тэрыторыі Украіны ў часы гітлераўскай акупацыі, а цяпер блаславяюць падрыхтоўку да новай сусветнай бойні. Памфлеты друкуюцца ў перакладзе Р. Няхая.

«Сустрэчы з настаўнікам» — так назваў Іван Шамякін свой артыкул, у якім расказвае пра незабыўныя сустрэчы з Якубам Коласам.

Вялікі артыкул, прысвечаны аналізу творчасці Антона Бялевіча, друкуе ў нумары крытык Рыгор Бярозкін.

У раздзеле «Бібліяграфія» змешчаны рэцэнзіі: Р. Шкрабы — на кнігу М. Яфімавай аб творчасці старэйшага беларускага дзіцячага пісьменніка Янкі Маўра; І. Кудраўцава — на зборнік матэрыялаў аб жыцці і творчай дзейнасці Кузьмы Чорнага, а таксама друкуецца некалькі кароткіх рэцэнзій на новыя кнігі, выдадзеныя Дзяржаўным выдавецтвам БССР.

На апошніх старонках часопіса куток гумару і сатыры «Дзядоўнік на Парнасе».

«МАЛАДОСЦЬ»

У нумары новая аповесць Міколы Лупсякова «Людзі прагнуць» — пра мужнасць і адданасць Радзіме савецкіх людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны, апавяданні Уладзіміра Караткевіча «У шалашы» і Уладзіміра Новіка «Саламеішын прымак», падборкі вершаў Ніла Гілевіча, Фёдара Чэрні, Івана Сіпакова, Юрася Свіркі і Артура Вольскага. У перакладзе з чэшскай мовы друкуюцца замалёўкі вядомых чэшскіх вучоных-падарожнікаў Іржы Ганзелкі і Міраслава Зігмунда «Па дарогах свету». «Слухаючы Чайкоўскага» — так называецца матэрыял, прысвечаны 120-годдзю з дня нараджэння Пятра Ільіча Чайкоўскага.

Пра многае даведваецца наша моладзь, прачытаўшы карэспандэнцыі, якія некалі, у 1927—1938 гадах, друкаваліся ў беларускіх маладзёжных газетах і змешчаны, як летапіс камсамола Беларусі, у гэтым нумары часопіса ў сувязі з надыходзячым 40-годдзем Ленінскага камсамола Беларусі. Гэтай даце прысвечаны нарыс Браніслава Спрынчана «Чыстыя крыніцы» і артыкул А. Дольнікава «Подзвіг Сяргея Грыцаўца».

Пра нашых сучаснікаў, іх працоўныя подзвігі расказваецца ў рэпартажах Б. Стральцова «Кавалі свайго лёсу», П. Пранузы «Светла ў вокнах», Г. Лойкі і А. Вечаркова «Мінская вясна 1960» і нарысе П. Бародкі «Хлопец з Мяцявіч».

У раздзеле «Маладосць» вядзе рэпартаж...» змешчаны артыкулы «Вечарамі ў Скідзелі» і «Дом — помнік», прысвечаныя памяці Элізы Ажэшкі, «Мова дружбы» — пра сяброўскія сустрэчы маладых вучоных-філолагаў розных краін у Мінску.

Раздзел «Давайце пагаворым...» прадстаўлены артыкулам «Усміхнися, таварыш!» Р. Самусенкавай. У ім узнімаецца пытанне аб паводзінах чалавека ў грамадскім быту, аб ветлівасці, добразычлівых адносінах паміж людзьмі. У раздзеле «Наша пошта» змешчаны карэспандэнцыі чытачоў: інжынера-лесавода Г. Маргайліка «Шануйце зялёнага друга», Л. Побаль «Знаходка, якой 2000 год» і вынікі выступлення часопіса ў студзеньскім нумары з артыкулам «Турботы сельскага вынаходніка».

М. Сталяроў у артыкуле «Літаратура крылатай думкі» падрабязна спыняецца на дадатных і адмоўных баках навукова-фантастычных твораў, у прыватнасці на аповесцях Я. Маўра «Фантамабіль прафесара Цылякоўскага», І. Яфрэмава «Туманнасць Андрамеды» і М. Гамолкі «Шосты акіян».

У раздзеле «Спорт» выступаюць сакратар ЦК ЛКСМБ тав. Смірнова з артыкулам «На стадыёны, сельскія спартсмены!» і Л. Воблікава з нарысам аб беларускім чэмпіёне па боксу Ул. Бацвінніку.

Заканчваецца часопіс раздзелам «Гумар і сатыра».

Да нумара, як заўсёды, прыкладаецца бясплатны дадатак у дапамогу гурткам мастацкай самадзейнасці «А гармонік грае, грае...»

«БЕЛАРУСЬ»

Нумар адкрываецца артыкулам С. Грахоўскага «Вясна ідзе па зямлі».

Пра дружбу працаўнікоў Брэсцкай вобласці са сваімі суседзямі з Люблінскага ваяводства Народнай Польшчы піша ў карэспандэнцыі «Дружба суседзяў» І. Чарняўскі. Пра дасягненні жывёлаводаў калгаса імя Кірава Мінскай вобласці расказвае загадчык малочнай фермы калгаса М. Максімовіч.

У нумары змешчаны нарысы «Каля агнявога патока» Б. Спрынчана, «Шукальнікі» П. Валкадаева, «Наша беларусачка» С. Бабронак. Уражаннямі ад паездкі ў Чэхаславакію дзеліцца ў падарожных нататках В. Нікіфаровіч.

Мастацкая проза прадстаўлена апавяданнямі «Чайка» Я. Шарахоўскага, «Залатая зорка» П. Пестрака. Таксама надрукаваны ўрывак з новага рамана А. Шашкова, аднаактоўка Ул. Няфёда «Жыць на гэтым свеце».

Партызанскім сатырычным выданням часоў Вялікай Айчыннай вайны прысвечаны артыкул «Сатырычныя залпы» Л. Вірні.

Часопіс друкуе падборкі вершаў А. Русецкага, С. Гаўрусёва, А. Пысіна, вершы Я. Пушчы, А. Лойкі, П. Пранузы, К. Цвіркі.

Цікавыя ў нумары фотарэпартажы пра будаўнікоў, удзельнікаў сельскай мастацкай самадзейнасці, артыкул галоўнага інжынера лабараторыі электрычных лічыльных машын АН БССР В. Валяўкі «Электронны матэматык працуе», нататка Н. Кедалавай пра рукапісны часопіс Саюза мастакоў БССР «Трыбуна мастака».

У раздзеле «Новыя кнігі» змешчаны кароткія рэцэнзіі на кнігу І. Краўчанкі «Работа Кампартыі Беларусі ў тыле ворага» (1941 — 1944 г.г.), зборнік Я. Брыля «Мой родны кут», на новыя аповесці І. Шамякіна, аб'яднаныя ў кнігу «Трывожнае шчасце», на зборнікі вершаў «Светлая хваля» К. Кірэенкі і «Сіні ранак» А. Пысіна, а таксама на нарыс М. Паслядовіча «Мяцежнае сэрца».

УКРАІНСКІЯ СУСТРЭЧЫ

Дзяржаўны народны аркестр Беларускай ССР наведаў Украіну.

... Не прайшло яшчэ двух год з таго часу, як наш аркестр выступаў перад слухачамі братняй рэспублікі. І вось зноў аўтобусы, на якіх мы падарожнічаем, праехалі пад белай аркаю, за якой пачынаецца ўкраінская зямля. У мінулы раз мы пабывалі амаль ва ўсіх буйных гарадах усходніх раёнаў Украіны, а закончылі выступленні канцэртамі ў Львове. Цяпер наш шлях — па раёнах Прыкарпацця.

Мы пачалі гастролі канцэртамі ў Роўна — старажытным горадзе з багатай і цікавай гісторыяй рэвалюцыйнай барацьбы і гераічных подзвігаў у імя народнага шчасця. Тут, пад Роўна, загінуў легендарны герой грамадзянскай вайны Алека Дуйдзіч. Тут рабілі слаўныя подзвігі ровенскія партызаны і сярод іх Герой Савецкага Саюза Мікалай Кузняцоў — бясстрашны партызанскі разведчык, які дзейнічаў пад выглядам нямецкага афіцэра. Тут, у вёсцы паблізу Роўна, нарадзіўся выдатны пісьменнік Мікалай Астроўскі.

Мы далі ў Роўна два канцэрты, якія выклікалі вялікую цікавасць у слухачоў. Перад пачаткам выступленняў мастацкі кіраўнік аркестра І. Жыновіч расказваў аб гісторыі калектыву. Пасля канцэртаў мы атрымалі шмат падзяк.

Львоў сустрэў нас як старых знаёмых. На канцэрце ў зале акруговага Дома афіцэраў прысутнічала шмат слухачоў, якія запомнілі выступленні аркестра ў пазалетнім сезоне і палюбілі наш калектыў. Яны прыйшлі да нас за кулісы, гаварылі пра вялікую цікавасць да беларускіх песень на Украіне, пра тую павагу, якой карыстаюцца тут беларускія творчыя калектывы.

У гутарцы з аўтарам гэтых радкоў дырыжор вядомай львоўскай капэлы «Трэмбіта» заслужаны артыст УССР Уладзімір Васілевіч сказаў, што па чысціні інтанацыі і мяккасці гучання ён лічыць Беларускую дзяржаўную капэлу, якой кіруе Р. Шырма, лепшай у нашай краіне. Высока ацэньваючы выступленні аркестра, нашы львоўскія сябры многа добрых слоў сказалі і пра салістаў—народную артыстку БССР Тамару Ніжнікаву, салістку філармоніі Людмілу Шубіну, саліста Беларускага радыё Юрыя Смірнова, маладых спевакоў Элеанору Зігер і Віктара Вуячыча, цымбалістаў Веніяміна Бурковіча і Мікалая Шмелькіна.

Кіраўнікі акруговага Дома афіцэраў у знак падзякі за добрыя выступленні арганізавалі для нас у вольны ад канцэртаў дзень экскурсію па Львову. Мы наведалі курган Славы, на якім пахаваны героі грамадзянскай і Айчыннай войнаў. Гэты своеасаблівы пантэон, ля ўваходу ў які гарыць вечны агонь, выклікае пачуццё вялікага хвалявання. Былі мы і на вядомых сваімі помнікамі Лычакоўскіх могілках і схілілі галовы ля магіл вялікага Івана Франко і палымянага барацьбіта супраць цемрашальства—Яраслава Галана.

Увечары гасцінныя гаспадары запрасілі нас на спектакль «Вялікі вальс» у Тэатры оперы і балету.

Апроч канцэртаў у Роўна і Львове, наш аркестр выступаў у Чарнавіцах, Станіславе, Жытоміры і іншых гарадах Украіны. Усюды нам аказвалі гарачы прыём. Глядзельныя залы былі ўпрыгожаны флагамі Украіны і Беларусі. Нам дарылі кветкі, узнагароджвалі ганаровымі граматамі. Але самым каштоўным падарункам для нас была цеплыня сэрцаў нашых слухачоў. І гэтую цеплыню мы прывезлі з сабою ў Беларусь.

В. БАРСАЎ.

□

На здымку: Беларускія музыканты на кургане Славы ў Львове.

Фота **М. Рубінштэйна.**

Купалаўскі вечар

Па ініцыятыве выкладчыка беларускай мовы і літаратуры Н. Саевіч школа № 7 г. Мазыра правяла днямі цікавы Купалаўскі вечар.

Любоўна быў афармлены стэнд аб жыццёвым і творчым шляху Янкі Купалы. Прыцягвала да сябе ўвагу і выстаўка ілюстрацый, выкананая вучнямі школы да твораў паэта.

Змястоўны даклад аб жыцці і дзейнасці Янкі Купалы падрыхтавала вучаніца 10 класа Н. Дубікоўская.

На вечары былі прачытаны вершы паэта, выканана некалькі песень на яго словы. Затым драматычны калектыў паказаў спектакль «Паўлінка».

Для працаўнікоў палёў

Для культурнага абслугоўвання працоўных Гродзенскай і Брэсцкай абласцей у час вясенне-летняй пасяўной кампаніі Тэатр оперы і балету накіраваў канцэртную брыгаду.

У складзе брыгады — народныя артысты БССР С. Друкер, М. Зюванаў, Т. Ніжнікава, А. Нікалаева, заслужаная артыстка рэспублікі Л. Галушкіна, артысты В. Чарнабаеў, С. Грахоўскі, М. Дружына, Н. Ражнова, Н. Дзвінянінава і інш.

НОВЫЯ КНІГІ

Выйшлі з друку і паступілі ў продаж наступныя кнігі мастацкай і дзіцячай літаратуры, выдадзенай Дзяржаўным выдавецтвам Беларусі:

Пятрусь Броўка. Далёка ад дому. Вершы. Мастак М. Гуціеў. Тыраж 5 тыс. экз., стар. 80. Цана 1 руб. 05 кап.

Уладзіслаў Нядзведскі. Запрашэнне. Вершы. Мастак Г. Клікушын. Тыраж 3 тыс. экз., стар. 96. Цана 1 руб. 25 кап.

Яраслаў Пархута. Казка зялёнай дубровы. Для дашкольнага ўзросту. Малюнкі А. Тычыны. Тыраж 16 тыс. экз., стар. 20. Цана 1 руб. 15 кап.

Пятро Панч. Сын Тарашчанскага палка. Пераклад з украінскай мовы І. Скапарава. Малюнкі П. Калініна. Для сярэдняга ўзросту. Тыраж 8 тыс. экз., стар. 136. Цана 2 руб. 80 кап.

Эно-Рауд. Так ці так. Для дашкольнага ўзросту. Малюнкі І. Някрасава. Тыраж 60 тыс. экз., стар. 16. Цана 1 руб. 45 кап.

Віталій Костылеў. Падснежнікі нясуць. Лірыка. На рускай мове. Мастак І. Славянін. Тыраж 3 тыс. экз., стар. 68. Цана 80 кап.

Сяргей Свірыдаў. «Цені знікаюць». Сатырычная камедыя ў трох дзеях, сямі карцінах. Мастак І. Немагай. Тыраж 2 тыс. экз., стар. 84. Цана 1 руб. 75 кап.

Уладзімір Паўлаў. Узлётная паласа. Вершы. Мастак Б. Аракчэеў. Тыраж 3 тыс. экз., стар. 68. Цана 60 кап.

Іван Шамякін. Глыбокая плынь. Раман. На рускай мове. Аўтарызаваны пераклад з беларускай мовы С. Грыгор'евай. Ілюстрацыі Ю. Пучынскага. Вокладка М. Гуціева. Тыраж 100 тыс. экз., стар. 304. Цана 6 руб. 35 кап.

П. Валкадаеў. Зялёны прыстанак. Вершы. На рускай мове. Мастак І. Сталяроў. Тыраж 4 тыс. экз., стар. 72. Цана 75 кап.

Барыс Сачанка. Дарога ішла праз лес. Апавяданні. Мастак М. Гуціеў. Тыраж 5 тыс. экз., стар. 200. Цана 1 руб. 65 кап.

Іван Сіўцоў. Нягоды і радасці. Раман. Мастак Ю. Архіпаў. Тыраж 10 тыс. экз., стар. 272. Цана 5 руб. 60 кап.

К. Шной-Красікаў. Шумелі Саяны. Раман. На рускай мове. Мастак П. Калінін. Тыраж 30 тыс. экз., стар. 212. Цана 6 руб. 35 кап.

ЭЦЮДЫ ПРА ВЯЛІКАГА ПЕСНЯРА

Творчасць Якуба Коласа — цэлая эпоха ў беларускай літаратуры. Народны паэт Беларусі адлюстраваў многія важнейшыя гістарычныя падзеі ў жыцці свайго народа, сучаснікам якіх быў. Героем твораў Якуба Коласа заўсёды быў сучаснік пісьменніка, захоплены гістарычнымі падзеямі, якія хвалявалі народ больш як паўстагоддзя.

Якуб Колас працаваў ва ўсіх асноўных жанрах беларускай літаратуры — ствараў вершы і апавяданні, манументальныя паэмы і аповесці, драматычныя творы, публіцыстычныя і літаратурна-крытычныя артыкулы. І ва ўсіх гэтых жанрах ён выступіў як класік беларускай літаратуры, выдатны пісьменнік-наватар.

З такімі думкамі дачытваеш апошнія старонкі нядаўна выпушчанай Дзяржаўным выдавецтвам БССР кнігі крытычных эцюдаў аб творчасці Якуба Коласа «З глыбінь жыцця» І. Навуменкі.

Вершы і апавяданні як дарэвалюцыйнай пары, так і савецкага часу, паэмы «Новая зямля» і «Сымон-музыка», трылогія «На ростанях», аповесці «На прасторах жыцця», «Адшчапенец», «Дрыгва» — усе гэтыя творы, як і некаторыя іншыя, аўтар эцюдаў імкнецца «прачытаць... з пункту гледжання таго, наколькі звязаны яны з канкрэтнымі падзеямі жыцця». Аўтар эцюдаў меў на мэце адказаць на пытанне: «Чаму творы Якуба Коласа перажылі свой час, чаму яны не трацяць эстэтычнай вартасці, нягледзячы на тое, што многія падзеі, якія іх выклікалі да жыцця, сталі ўжо гістарычным мінулым».

Падыходзячы да сваёй працы з такім заданнем, аўтар праводзіць праз яе, як асноўнае, палажэнне аб тым, што «эстэтыка Якуба Коласа народная па сваёй сутнасці». Гэты правільны зыходны пункт забяспечыў магчымасць крытыку ў асноўным справіцца з пастаўленай перад сабой задачай. І яшчэ адна акалічнасць спрыяла паспяховаму вырашэнню пастаўленых у кнізе праблем: аўтар з глыбокай павагай і шчырай любоўю гаворыць аб творах народнага паэта, на якіх выхавалася не адно пакаленне савецкіх людзей.

Пра творчасць Якуба Коласа сёння напісана сотні артыкулаў розных памераў, дзесяткі фундаментальных манаграфій і даследаванняў. І тым не менш, кніга І. Навуменкі зойме сваё месца сярод літаратурна-крытычных прац аб народным паэце.

Праўда, у І. Навуменкі мы не знойдзем поўнага і паслядоўнага разгляду творчасці Якуба Коласа. Як відаць, аўтар і не ставіў перад сабою такой задачы. Вось чаму «З глыбінь жыцця» — не сістэматызаванае даследаванне, нават і не асобныя нарысы, а толькі эцюды. Аўтар іх бярэ з творчасці Якуба Коласа некалькі важнейшых праблем і прасочвае, як іх ставіў, распрацоўваў і вырашаў народны паэт.

Першы эцюд «Новы вобраз простага чалавека» прысвечаны герою дарэвалюцыйных вершаў і апавяданняў Якуба Коласа, а таксама яго выдатнага твора «Новая зямля». Аўтар пераканаўча даводзіць, што вобраз селяніна-бедняка — галоўны вобраз усёй дарэвалюцыйнай творчасці народнага паэта, што гэта сапраўды новы вобраз простага працоўнага чалавека ў беларускай літаратуры, хоць чалавеку працы прысвечана творчасць усіх лепшых беларускіх пісьменнікаў XIX ст.

Цікава і арыгінальна вытлумачвае І. Навуменка паэму «Новая зямля» як «заканамерны крок у творчым развіцці паэта». Уся папярэдняя творчасць Якуба Коласа разглядаецца як своеасаблівая падрыхтоўка да стварэння манументальнага палатна, у якім лірычны герой паэта «паўстае ва ўсёй сваёй паўнаце і велічы». Крытык правільна ацэньвае паэму як гімн чалавеку працы і як твор, які прыводзіць да думкі аб неабходнасці «рэвалюцыйнай ломкі старога жыцця».

Наступны эцюд «Прасторы жыцця» прысвечаны трылогіі «На ростанях», аповесці «На прасторах жыцця». Робяцца таксама заўвагі аб некаторых іншых празаічных творах Якуба Коласа.

У пачатку эцюда аўтар выказвае цікавыя меркаванні ў сувязі з пытаннем: «Як прыняў Якуб Колас Кастрычніцкую рэвалюцыю?» Пытанне гэтае зацікавіла аўтара эцюдаў не выпадкова, бо, як ён сцвярджае (а гэта сапраўды так), «у нашай крытычнай літаратуры да апошняга часу бытуе думка, што Якуб Колас слаба адгукнуўся на рэвалюцыйныя падзеі». Крытык абвяргае гэтую думку і лічыць, што на пастаўленае пытанне адказ можа быць толькі адзін: усе сімпатыі паэта былі на баку рэвалюцыі. Яна знішчыла ненавіснае яму царскае самадзяржаўе, засілле памешчыкаў, перадала ўладу народу. Нам думаецца, довады крытыка, якія ён прыводзіць у абарону свайго пункту погляду, дастаткова пераканаўчыя. Гэта, у першую чаргу, факт работы пісьменніка ў гады рэвалюцыі і грамадзянскай вайны над паэмамі «Новая зямля» і «Сымон-музыка», накіраванымі супраць дарэвалюцыйнага грамадскага ладу. Аб тым, што пісьменнік у хуткім часе пасля Кастрычніка ўжо ўмеў правільна і беспамылкова асэнсоўваць тое, што адбывалася ў жыцці, сведчаць першыя часткі трылогіі «На ростанях», а аб тым, што ён цвёрда становіцца на пазіцыі сацыялістычнага рэалізму, — аповесць «На прасторах жыцця».

Наша крытыка не аднойчы ставіла пытанне аб аўтабіяграфічнасці трылогіі «На ростанях». Гаворыць аб гэтым і І. Навуменка. Але ён здолеў па-свойму падыйсці да гэтага пытання. Добра разумеючы, што «мастацкі твор — не фатаграфія» і што, тым не меней, «сапраўдны мастацкі твор лепш за ўсякую фатаграфію ўзнаўляе праўду жыцця», крытык прыводзіць цікавыя факты з жыцця Якуба Коласа, да гэтага часу невядомыя.

І. Навуменка робіць спробу высветліць адносіны Якуба Коласа да аб'яднання «Маладняк» на матэрыяле выказванняў пісьменніка па пытаннях эстэтыкі і літаратуры і, галоўнае, на матэрыяле яго твораў. Ён прымушае нас па-новаму прачытаць некаторыя апавяданні пісьменніка і яго аповесць «На прасторах жыцця»: крытык паказвае, што гэты твор палемічны, накіраваны супраць эстэцкіх тэндэнцый у творчасці асобных маладых пісьменнікаў 20-х гадоў. Крытык, апрача таго, бачыць выключна вялікае значэнне аповесці ў тым, што пісьменнік вырашае ў ёй праблему выхавання характару і светапогляду маладога будаўніка камунізма «ў поўнай адпаведнасці з тымі задачамі, якія ставіла перад моладдзю камуністычная партыя».

Шчыра і цёпла напісаны эцюд «Праца, побыт, прырода».

Эцюды І. Навуменкі захапляюць чытача ўсхваляванасцю і цеплынёй пачуцця да народнага паэта Беларусі і яго творчасці; часта адчуваецца, што піша не столькі літаратурны крытык, колькі пісьменнік-публіцыст.

Нельга не адзначыць цікавага прыёму, якім карыстаецца ў сваіх эцюдах І. Навуменка, — частых супастаўленняў і паралелей. Дзякуючы ім, крытыку ўдаецца часам па-новаму асвятліць некаторыя пытанні творчасці Якуба Коласа. Так, цікавая паралель праводзіцца паміж героямі апавяданняў Якуба Коласа «Малады дубок» і М. Горкага «Шабры»; супастаўленне трылогіі «На ростанях» і рамана Ц. Гартнага «Сокі цаліны» дапамагае крытыку правільна ацаніць значэнне абодвух названых твораў у справе фарміравання жанра рамана ў беларускай літаратуры.

Праўда, трэба адзначыць, што часам крытык толькі называе тыя або іншыя з'явы літаратуры ці творчасці Якуба Коласа і не разгортвае намечаныя паралелі. Так, напрыклад, выглядае супастаўленне некаторых апавяданняў Якуба Коласа з творам М. Горкага «Кірылка». А гэтае супастаўленне безумоўна дапамагло б ускрыць важныя заканамернасці, агульныя для творчасці М. Горкага і Якуба Коласа. Часам некаторыя нечаканыя супастаўленні застаюцца незразумелымі толькі таму, што яны не разгорнуты. Вось, напрыклад, крытык стаўляе поруч такіх гераінь, як Ядзвіся («У палескай глушы») і Аленка («На прасторах жыцця»): «вобраз Алены Гарнашкі, намаляваны цёпла, рэалістычна, нагадвае некаторымі сваімі рысамі вобраз Ядзвісі з «Палескіх аповесцей». Але чым падобны гэтыя гераіні адна да адной — аўтар не гаворыць.

Ёсць у эцюдах І. Навуменкі сцвярджэнні, якія патрабуюць пэўных тлумачэнняў. Так, у першым эцюдзе сказана, што перадавыя беларускія пісьменнікі ў дарэвалюцыйны час друкавалі рэвалюцыйныя творы ў газеце «Наша ніва» — буржуазнай і, як зазначае крытык, з нацыяналістычным душком. Але аўтар крытычных эцюдаў не дае тлумачэння, чаму на старонках буржуазнай, з нацыяналістычным душком «Нашай нівы» друкаваліся рэвалюцыйныя вершы. Магчыма, творы рэвалюцыйна-дэмакратычных пісьменнікаў, да пэўнай ступені ачышчалі паветра «Нашай нівы» ад буржуазна-нацыяналістычнага душка? Вядома, што аб «Нашай ніве» ў беларускім літаратуразнаўстве пісалася нямала, і тым не менш І. Навуменку тут варта было хоць бегла паставіць пытанне аб пазіцыі газеты.

Асобныя палажэнні, якія выстаўляе аўтар, часта вельмі важныя, засталіся неразвітымі, і ад гэтага эцюды многа трацяць у пераканальнасці. Так, у самым пачатку кнігі І. Навуменка бегла зазначае: «У тым, што пасялі Купала і Колас да Кастрычніка, былі ўжо зерні той новай праўды веку, якая абумовіла нараджэнне літаратуры сацыялістычнага рэалізму». Гэтую думку неабходна было развіць і пераканаўча абгрунтаваць.

На жаль, неаднаразова сустракаюцца выпадкі, калі аўтар ставіць тое ці іншае пытанне і тут жа, замест таго, каб высветліць да канца, пакідае яго і пераходзіць да новага. Часам ён зноў вяртаецца да некалі пакінутага пытання. Атрымліваюцца непатрэбныя паўторы, іншы раз слова ў слова. Ствараецца ўражанне, быццам аўтар забывае тое, пра што гаварыў раней. Вось адзін з найбольш прыкрых (на жаль, неаднаразовых) выпадкаў паўтарэння адной ісціны ў розных месцах кнігі. На стар. 48 крытык піша: «Аповесць «На прасторах жыцця» з'явіцца своеасаблівым працягам «Палескіх аповесцей» і на стар. 61: «На прасторах жыцця» — своеасаблівы працяг «Палескіх аповесцей». Сустракаюцца выпадкі, калі аўтар па некалькі разоў вяртаецца да аднаго і таго ж пытання. Так, аб гумары ў дарэвалюцыйных апавяданнях Якуба Коласа І. Навуменка гаворыць у трох месцах (стар. 14, 19, 24—25).

Ёсць у эцюдах палажэнні і сцвярджэнні, якія выклікаюць пярэчанні. Вось прыклад: «Аповесць «Адшчапенец» не стала творчай удачай Я. Коласа, што прызнаваў і сам аўтар. Твор носіць вельмі выразны адбітак схематычнасці, павярхоўнасці. Адной з самых істотных хібаў твора, на нашу думку, з'яўляецца адсутнасць станоўчага героя, які б мог супрацьстаяць Пракопу Дубягу» (стар. 76). Нельга не пагадзіцца з І. Навуменкам, калі ён гаворыць аб пэўнай схематычнасці, павярхоўнасці ў паказе ў аповесці калгаснага жыцця і некалькі ніжэй аб «налёце апісальніцтва», «аб падмене мастацкага паказу падзей расказам аб іх». Але, нам здаецца, зусім неабавязкова пісьменніку было супрацьстаўляць Пракопу Дубягу нейкага станоўчага героя. Справа ў тым, што чытач зусім не разглядае вобраз Пракопа Дубягі як адмоўны, як не разглядаецца ў такім жа плане і Мікіта Маргунок з «Страны Муравіи», якую ніяк не выпадае лічыць творчай няўдачай А. Твардоўскага, хоць і тут герою не супрацьстаўляецца нейкі спецыяльны носьбіт станоўчага.

Могуць выклікаць пярэчанні і некаторыя іншыя палажэнні аўтара эцюдаў. Адзначым толькі недаравальную памылку. На стар. 83 чытаем: «Кузница» як літаратурная група перастала існаваць яшчэ ў самым пачатку 20-х гадоў». Сапраўды ж «Кузница» існавала, як вядома, з 1920 па 1932 г.

Такія, на наш погляд, вартасці і недахопы ўвогуле цікавых і карысных эцюдаў аб творчасці народнага паэта Беларусі.

Л. ЦАРАНКОЎ.

ДА 15-годдзя ВЫЗВАЛЕННЯ ЧЭХАСЛАВАКІІ АД ФАШЫСЦКАЙ АКУПАЦЫІ

НАША ДРУЖБА НА ВЕКІ ВЕЧНЫЯ

Слова пра братні народ

Гаварыць пра характэрныя рысы той ці іншай краіны можна нават з першага ўражання, калі ў назіральніка ёсць хоць якія веды па гісторыі гэтага народа. Так адразу падумалася мне, калі ў верасні 1958 г. у групе савецкіх турыстаў я наведаў Чэхаславакію. Што такое, напрыклад, граніца? Гэта ж вузкая мяжа, якую, разбегшыся, можа пераскочыць добры спартсмен. Аднак за ёй пачынаецца тая няўлоўная ці ледзь улоўная розніца паміж паграніччам Заходняй Украіны і Чэхаславакіяй. Адразу заўважаецца іншы пейзаж, іншы колер неба, іншыя краявіды.

Чэхаславакія!.. Зацятая, доўгая барацьба народа за сваё існаванне, за нацыянальную самастойнасць. У гэтай барацьбе Чэхаславакія страціла мільёны сваіх сыноў і дачок. Чэхі і славакі чэрпалі сілу, натхненне ў барацьбе з прыгнятальнікамі не толькі ў сябе на радзіме — позіркі іх заўсёды былі скіраваны на ўсход—з вераю, што адтуль, ад рускага народа, прыйдзе яно — жаданае вызваленне.

Сярод славянскіх краін Чэхаславакія вылучаецца высокай старажытнай культурай. Гэтая акалічнасць накладвае адбітак і на яе цяперашняе культурнае жыццё. Цікавае спалучэнне старадаўняй і сучаснай культуры суседнічае з адметным славянскім побытам, каларытам. Нездарма Ленін, пабываўшы ўпершыню ў Празе ў лютым 1902 г., пісаў у пісьме да сваёй маці: «Асабліва кідаўся мне ў вочы яе славянскі характар, шкадую, што не займаўся чэшскай мовай...»

Здзіўляе працавітасць, беражлівасць чэхаславацкага народа, яго разумнае стаўленне да прыродных багаццяў краіны. Лішняга не кідаць марна на зямлю, пад ногі — гэта неразумна. Усё трэба прыбраць, як мага выкарыстаць для жыцця чалавека, для свайго народа—пачынаючы ад каменнага вугалю і канчаючы апошняй травінкай на чэхаславацкіх узгоркавых палях. Эканомія пры забудове вуліц, пры будаўніцтве дарог. Трэба больш зямлі для збожжа, для кармавых культур. Асаблівым, я сказаў бы класічным, сведчаннем турботлівасці і стараннасці з'яўляецца сталіца Чэхіі — Прага. Хто хоча паглядзець наслаенні культур вякоў, няхай едзе сюды. Вялізарны горад з помнікамі сярэдневякоўя і з велічнай панарамай горада XIX стагоддзя. І нягледзячы на яскравыя адзнакі сучаснага стылю, славянскі каларыт прысутнічае ў горадзе ўсюды — у касцюмах, у вырабах хатняга побыту, у шыльдах, надпісах і г. д.

Хораша ўсведамляць, што такая Чэхаславакія, упрыгожаная зайздроснай гісторыяй свайго народа, прышла да нашых сацыялістычных дзён. Чэхаславацкі народ святкуе зараз 15 год свайго сацыялістычнага існавання. Праз гэтыя гады рабочы клас вызваленай ад капіталістычных пут краіны давёў свету сваю высокую сацыялістычную свядомасць, бо за такі кароткі час дасягнуў вялікіх вышынь у эканоміцы і культуры. Цяпер Чэхаславакія — краіна сапраўды сацыялістычная, прамысловая прадукцыя якой славіцца ва ўсім свеце.

Старадаўняе чэшскае народнае выслоўе гаварыла аб тым, што «чэшскаму народу толькі тады будзе добра, калі казацкі конь нап'ецца вады з Влтавы». Гэтае прароцтва збылося ў наш час.

І калі 12 снежня 1943 г. у Маскве быў падпісаны гістарычны Дагавор аб дружбе, узаемадапамозе і пасляваенным супрацоўніцтве паміж Чэхаславакіяй і СССР, прэзідэнт распублікі Клемент Готвальд сказаў, што гэтым дагаворам «здымаецца з плеч нашых народаў вялікі цяжар, які душыў іх стагоддзямі, — гэта страх за сваё існаванне». У гэтай фразе коратка сфармулявана праўда гістарычнага развіцця народа, яго імкненняў да свабоды.

У час апошняй вайны чэхаславацкі народ унёс нямалы ўклад у барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У час гэтай барацьбы загінулі тысячы патрыётаў. І калі ў жніўні 1944 г. выбухнула антыфашысцкае паўстанне ў Славакіі, некаторыя злучэнні Першага Украінскага фронта павялі наступленне цераз так званы Дуклінскі перавал (на мяжы з Польшай), каб прарвацца на дапамогу славацкаму народнаму паўстанню. У баях за Дуклю, за вызваленне чэхаславацкага народа аддалі жыццё тысячы савецкіх воінаў і больш шасці тысяч байцоў Чэхаславацкага армейскага корпуса. Гэта былі апошнія вялікія гістарычныя бітвы на чэхаславацкай зямлі, якія закончыліся перамогай над лютым ворагам. З гэтымі бітвамі здзейснілася адвечная мара чэхаславацкага народа, што прыйдзе рускі брат і вызваліць з няволі.

Свежыя ветры веюць зараз над гэтай горнай краінай, і на тварах чэхаў і чэшак, славакаў і славачак іскрыцца радасць вольнага жыцця. Як найлепшага друга сустракаюць тут госця з Савецкага Саюза.

Пішучы гэтыя словы напярэдадні 15-годдзя вызвалення Чэхаславакіі ад гітлераўскага ярма, цяжка ўтрымацца, каб не закончыць артыкул чэшскім словам: «Наздар!», што азначае «Няхай жыве». Няхай жыве братні чэхаславацкі народ, які паспяхова будуе сацыялізм!

Філіп ПЕСТРАК.

Станіслаў Костка НЕЙМАН.

О ГОРДЫМ БУДЗЬ!

О гордым будзь,
бо вытрываў,
бо не спаганіў вусны, грудзі
фальшывым воклічам.

Такім заўжды мой быў народ:
ці то з касой, ці з молатам.
Глядзеў з надзеяю на ўсход,
чакаў і верыў ён.

Свой плён цяпер збярэ ён сам
сям'ёй адзінаю.
Прэч са шляхоў! Братэрства храм
Будуем добраю часінаю.

Пераклаў з чэшскай мовы
С. ШУШКЕВІЧ.

Ян АЛЬДА

РАДЗІМЕ

Мой шлях сёння ўецца
Праз горы і рэкі.
Табе маё сэрца
Аддаў я навекі.

Гарыць светлай доляй
Нам сонца на ўеходзе.
У дзяжы твайго поля
Хлеб добры падходзіць.

На вольнае шыры,
Дзе роснае жыта,
Вясёлкаю міру
Уся ты спавіта.

Б'е ў рэчцы на золку
Рыб быстрых маланка.
Пчолам на золата
Цвітуць ліпы ў парках.

Плады росцім дзецям
Ля кожнае хаты.
Садам свежы вецер
Прыносяць Карпаты.

Ты клічаш да працы
Сваімі гудкамі.
У горы і шчасці
Заўсёды ты з намі.

Пераклаў з чэшскай мовы
Пятро ПРЫХОДЗЬКА.

Мілан ЛАЙЧ'ЯК.

Голас Робсана

Настала цішыня. Ты быў між намі.
Твой мужны спеў мы слухалі вось тут.
Ты хваляваўся, Робсан, брат.
Гарэлі вочы. Шмат у іх пакут
За тых, каго залінчавалі.
Твой голас наракаў на вылюдскі закон.

У гордым позірку іскрылася свабода,
З нізін далёкіх голас твой ляцеў.
Як альбатрос, кружыў над намі
З-за акіяна прывітальны спеў.
У тым і драма,
Што цяжка ўсім,
Але спяваеш ты за ўсіх.

Са славенскай мовы
пераклаў С. ШУШКЕВІЧ.



Масква. У парку культуры і адпачынку «Сакольнікі» да 15-й гадавіны вызвалення Чэхаславакіі Савецкай Арміяй адкрылася выстаўка «Чэхаславакія 1960 года», якая паказвае поспехі краіны за гэты перыяд у развіцці прамысловасці, навукі, культуры, у павышэнні жыццёвага ўзроўню народа.

На здымку: ля стэнда, дзе экспануюцца чэхаславацкія аўтамабілі апошніх мадэлей.

Фота Л. Вялікжаніна і Н. Рахманава.
Фотахроніка ТАСС.

БРАТЭРСТВА ПА ЗБРОІ

Ён стаяў ля акна вагона і задумённа глядзеў удалячынь. Гэта быў мой стары знаёмы, галоўны інжынер саўгаса «Хальч» Кузьма Чарненка, шыракаплечы, строгі, апрануты ў цудоўны цёмнасіні касцюм. На яго грудзях зіхацеў ордэн Леніна. Белая шаўковая сарочка яшчэ больш аздабляла яго абветраны і ўзмужнелы твар. Я павітаўся з ім і запытаў:

— На поўдзень, на курорт, Кузьма Хвядосавіч?

— Да старых сяброў у Чэхаславакію, — адказаў ён. — У вайну разам ваявалі.

І Чарненка пачаў паволі расказваць аб сваім першым знаёмстве з далёкімі сябрамі, да якіх цяпер ехаў у госці.

... Заданне было не лёгкае: узарваць мост на аўтастрадзе Брэст — Масква.

Чарненка ведаў, што ля моста размешчан невялікі нямецкі атрад. Апрача таго, уначы гітлераўцы асвятляюць падыходы пражэктарамі і ракетамі, ля абочын — міны і калючы дрот. Заставалася адно: узарваць мост днём. Але як? Прыдумвалі дзесяткі варыянтаў, але ні адзін не падыходзіў. Чарненка даўно выношваў смелы план, і ўсё гаварыла за тое, што наспеў час яго здзейсніць.

І вось яны зноў ідуць у разведку: камандзір атрада Чарненка і два партызаны. З боку глянеш, быццам мірныя сяляне ідуць: размаўляюць, цыгаркі кураць. Але пад латанымі кажухамі — аўтаматы. Ішлі да школы.

— Выканаць аперацыю дапамогуць славакі,—гаварыў камандзір.— Я даўно прыглядаюся да іх. Гэта добрыя хлопцы... Яны не хочуць ваяваць супраць нас...

Партызаны паціснулі плячыма, не разумеючы, што будзе далей.

— Тут два славакі часта ходзяць у вёску, — прадаўжаў Чарненка. — Мы павінны іх затрымаць. Ля школы зручная пазіцыя, і там у мяне ёсць адзін знаёмы... Настаўнік Здановіч...

Зайшлі ў школу. У канцы калідора адчыніліся дзверы. Выйшаў чалавек.

— Не пазнаяце, Мікалай Ваніфатавіч? — спытаў камандзір, калі той запрасіў партызан у свой пакойчык.

— Здаецца, Чарненка Кузьма, — сказаў настаўнік, углядаючыся ў твар свайго былога вучня.

— Я і ёсць, — як некалі вучнем, сарамліва ўсміхнуўся Кузьма Чарненка.

— Па справе да мяне ці мімаходам?

— Трэба, каб вы, Мікалай Ваніфатавіч, дапамаглі нам, партызанам.

— Дапамагчы? Але чым? Я ж стары і не чую...

— Заданне такое, — растлумачыў Чарненка. — У вёсцы цяпер знаходзяцца салдаты... Вы павінны выйсці на дарогу і папярэдзіць нас, калі яны будуць вяртацца. Нам трэба іх затрымаць.

Не прайшло паўгадзіны, як на дарозе паявіўся стары. Ён крочыў з узнятым каўняром паліто. Гэта значыла: славакі вяртаюцца.

Салдаты ехалі з вёскі Гуцішча. Яны сядзелі на санках, аб нечым размаўлялі. Ідучы насустрач, партызан схапіў за аброць каня, а Чарненка накіраваў на салдат аўтамат.

Адзін з іх ускочыў, а другі, малодшы са славакаў, усміхнуўся і сказаў па-руску:

— Рукі ўгару, гэта можна. Вы партызаны?!.

— Так, партызаны, — адказаў Чарненка.

— О, вельмі добра! — узрадаваўся малады салдат. — Мы даўно чакалі такой сустрэчы. — Ён працягнуў руку: — Тэадор Пола. А гэта мой сябра Нітч Юзеф. Мы хочам змагацца супраць немцаў.

Так славакі сталі савецкімі партызанамі. З іх дапамогай камандзір атрада Чарненка і пайшоў выконваць баявую аперацыю.

Парашылі раніцай напасці на атрад, які вартаваў мост. Але Тэадор Пола папярэдзіў: уначы і раніцай немцы вельмі пільна ахоўваюць мост... Тады, параіўшыся з камісарам і начальнікам штаба, Чарненка ўлічыў прапанову славака-партызана. Назаўтра сярод дня, калі на аўтастрадзе быў асабліва ажыўлены рух, партызаны рушылі ў дарогу. Мароз стаяў невялікі, дзьмуў лёгкі ветрык, зрэдку перамятаючы снег. Пераапрануўшыся ў нямецкую вопратку, партызаны паехалі на дзвюх фурманках.

Чарненка ведаў, што мост ахоўваюць два вартавыя. Падрыўная група раздзялілася на два аддзяленні. Мінулі ўзняты шлагбаум. Вартавы, які стаяў на мосце, нават не паварушыўся. Першая фурманка ўз'ехала на мост. Калі партызаны параўняліся з другім вартавым, — задняя фурманка толькі што пад'ехала да моста. Разлік быў правільным. Чарненка падаў знак рукой і ў адзін момант пакончылі з вартавымі. Падрыўнікі кінуліся пад устоі моста. Коней з санкамі адвялі ў бок. Аднадзве-тры мінуты — успыхнуў і зашыпеў бікфордаў шнур.

— Усе да санак, хутка! — загадаў Чарненка.

Коні ляцелі, нібы апантаныя. Вось і паваротка ў лес. Амаль адначасова грымнулі два выбухі. Мост узляцеў у паветра.

Так 11 лютага 1943 года быў узарваны мост праз раку Балатнянку.

Пазней падрыўную групу даверылі Дорыку, — так любоўна называлі партызаны Тэадора Пола. Разам са сваім земляком Юзефам і беларускімі партызанамі ён зрабіў смелы налёт на нямецкі склад з амуніцыяй.

... Прыйшла вясна. Партызаны 10-й Журавіцкай брыгады актывізавалі сваю дзейнасць. Аднойчы да Чарненкі прыйшлі Дорык і Юзеф. Яны прапанавалі дзёрзкі і смелы план: напасці на нямецкі штаб, які кватараваў у Журавічах.

Тры дні рыхтавалася група Дорыка да новай аперацыі. І зноў перамога: знішчаны некалькі гітлераўскіх афіцэраў, захоплены каштоўныя штабныя дакументы.

— Так, з дапамогай сяброў-славакаў мы выканалі не адно баявое заданне, — закончыў свой расказ Кузьма Хвядосавіч. — А потым, калі Гомельшчыну вызваліла Савецкая Армія, Тэадор Пола быў пераправлен у тыл ворага, у родную Чэхаславакію. А Юзеф Нітч ваяваў у Чэхаславацкім корпусе...

Чарненка на хвіліну змоўк.

— Пасля вайны доўга я пра іх нічога не ведаў. А потым дай, думаю, напішу пісьмо маці Тэадора, у мяне яе адрас быў. Праз колькі дзён і ад самаго Дорыка пісьмо прыйшло. Ён у Чэхаславакіі стварыў партызанскі атрад, потым брыгаду, а к канцу вайны брыгада пад камандай Пола вырасла ў партызанскае злучэнне імя Яна Жыжкі. Ён і цяпер служыць у Чэхаславацкай Арміі.

— А Юзеф Нітч?

— Быў двойчы паранены. Першы раз у нас, у партызанскім атрадзе, а другі раз на фронце атрымаў цяжкае раненне. Але нашы ўрачы з львоўскага шпіталю выратавалі яму жыццё. У канцы вайны, будучы сяржантам, ён удзельнічаў у вызваленні Чэхаславакіі. Цяпер ён будаўнік...

Кузьма Хвядосавіч дастаў з кішэні дзве фотакарткі. На адной з іх у партызанскай форме быў Тэадор Пола, на другой — Юзеф Нітч. У пісьме Тэадор Пола запрашаў Чарненку ў госці і паведамляў, што Кузьма Хвядосавіч за арганізацыю партызанскага руху сярод славакаў узнагароджан ордэнам «Чэхаславацкаму партызану». Чарненка беражліва схаваў пісьмо, фотакарткі і сказаў:

— Вось і еду да сваіх баявых сяброў...

* * *

Мінула з той сустрэчы больш паўгода. Нядаўна я зноў пабываў у саўгасе «Хальч», зноў убачыў заклапочанага Чарненку. Ён быў у палінялай ватоўцы, як заўсёды, кудысьці спяшаўся і скардзіўся на недахоп часу.

Але калі я запытаў у яго пра паездку ў Чэхаславакію, ён шчасліва ўсміхнуўся і сказаў:

— Хутка сябры з Чэхаславакіі прыедуць. Трэба сустракаць. — З кішэні дастаў фотакартку і дадаў: — Гэта ўспамін аб Чэхаславакіі.

На здымку: (злева направа) Кузьма Чарненка, Юзеф Нітч і Тэадор Пола.

Р. РАЗІНСКІ.

в. Хальч,
Веткаўскага раёна.

Віцезслаў НЕЗВАЛ.

УЗДЫХ

Шкада паперы
На няўдалыя кнігі,
Шкада сонца
Для засохлай галіны,
Шкада лодак, што патанулі ў рэках,
І слязіны шкада па благім чалавеку.

Пераклаў з чэшскай мовы
С. ШУШКЕВІЧ.

СПЕКТАКЛЬ ПА П'ЕСЕ БЕРТОЛЬДА БРЭХТА

Пражскі Тэатр камедыі з багатай літаратурнай спадчыны Бертольда Брэхта выбраў яго п'есу «Пан Пунціла і яго слуга Маці» і ў канцы студзеня паказаў яе на сваёй сцэне. П'есу паставіў Карэл Достаў, а галоўныя ролі выконвалі артысты Вацлаў Выдра, Іозеф Бэк і Бланка Багданава. П'еса сустрэла цёплы прыём пражскіх гледачоў.

ТРЭЦІ СЛАВАЦКІ ОПЕРНЫ КАЛЕКТЫЎ

У студзені ў Банскай Быстрыцы адбылася вялікая падзея ў галіне культуры. У Народным доме ўпершыню выступілі перад гледачамі члены трэцяга ў Славакіі прафесіянальнага опернага калектыву — артысты Тэатра імя І. Г. Тайоўскага, якія выступілі ў оперы І. Ферстэра «Ева».

А. МАКАЕНАК.

СЕМ'ЯМ ПАГРАЖАЛА НЕБЯСПЕКА

Драматург Андрэй Макаёнак закончыў кінасцэнарый, прысвечаны баявой дружбе чэхаў і беларускіх партызан у гады Вялікай Айчыннай вайны. Аўтар скарыстаў сапраўдныя факты баявой дзейнасці партызан Гомельшчыны.

Ніжэй друкуецца ўрывак са сцэнарыя.

Дом, дзе кватаруе чэх Мілан. Праз акно ён назірае за суседнім домам. Там, каля акна, стаіць дзяўчына. Гэта Лена. Мілан, ветліва ўсміхаючыся, чакае, каб сустрэцца з ёй поглядамі. Дзяўчына заўважыла яго і таксама дружалюбна ўсміхнулася. Потым яна перавяла погляд на вуліцу, і ўсмешка знікла з яе твару. Праз хвіліну Лена выбегла з хаты і кінулася на вуліцу.

Рыпнулі дзверы, у хату нехта зайшоў. Мілан спадзяваўся, што гэта Лена, але ў другі пакой ўвайшла гаспадыня — Вольга з дзецьмі. Некалькі дзён яна сядзела ў гестапа заложніцай. Яшчэ праз хвіліну ў хату прыбегла Лена і кінулася абдымаць суседку.

— Ты?

— Я.

— Цябе выпусцілі з гестапа?

— Выпусцілі...

— Гаротныя вы мае!

Лена прысела, абняла дзяцей. Яна гладзіла іх па галоўках, заглядала ў тварыкі, нібы шукаючы знакі ад катаванняў.

— Вас там мучылі?

— Не.

— Не? — Лена здзівілася не столькі адказу, колькі тону, якім гаварыла Вольга. Па яе ўзрушанаму твару можна было здагадацца, што здарылася нешта незвычайнае.

— А дзе тата? — спытала дзяўчынка.

— Не ведаю, дачушка, — адказала маці і, заплакаўшы, прытуліла да сябе дзяўчынку.

— Не бойцеся, ён жывы, ён цэлы, — супакоіла Лена жанчыну і па сакрэту паведаміла: — Ён у лесе, у партызанах.

Жанчына пакруціла галавой.

— Я сама яго туды завяла, — запэўніла Лена.

Вольга падняла галаву і з сумам паглядзела на Лену.

— Ён так баяўся за вас, так перажываў, — сказала Лена.

Мілан з свайго пакоя чуў усё гэта. Ад таго, што ён міжволі падслухаў чужую размову, яму стала няёмка, і ён адыйшоў да акна і ўбачыў: на двор дзеда Мікіты прыйшла група гестапаўцаў з Гюнтэрам і Пашка са старастам. Яны зайшлі ў хату. А з-за перагародкі чуліся галасы:

— Як жа вас выпусцілі?

— Муж выкупіў.

— Выкупіў? Як выкупіў? — здзівілася Лена.

— Не пытай, Лена, лепш не пытай, — прасіла Вольга.

Праз акно Мілан бачыў, як гестапаўцы выцягнулі з хаты старога Мікіту. Ён быў у адной бялізне, бінты былі сарваны.

Раптам стары ўпёрся і, заўважыўшы каля ганку сякеру, схапіў яе і замахнуўся на Пашку, але афіцэр некалькі раз стрэліў у дзеда з пісталета.

Стрэлы пачулі Вольга, Лена і дзеці. Яны кінуліся да акна і ўбачылі забітага старога і каля яго гестапаўцаў, старасту і мужа Вольгі — Пашку. Уражаная ўбачаным, Лена адхіснулася ад акна. Вольга павярнулася да яе.

— Вось так ён выкупіў нас.

Лена ірванулася да дзвярэй, але жанчына затрымала яе.

— Яны і цябе заб'юць! Стой! Я схаваю цябе.

Праз акно Мілан заўважыў, што сюды, да іх у хату, накіраваліся Гюнтэр і Пашка. Мілан выбег у другі пакой.

— Яны вас шукаюць! Хавайцеся! — ён схапіў за руку Лену і павёў у свой пакой.

— Я прывёў вам мужа вернага і надзейнага, — яшчэ з парога сказаў Гюнтэр.

Жанчына маўчала. Да яе прытуліліся перапалоханыя дзеці.

— О-о, якія мілыя дзікуны! — афіцэр узяў хлопчыка за падбародак, і той заплакаў.

— Ну-ну, не бойся, — і потым спытаў у жанчыны: — У вас чужых нікога няма?

У другім пакоі з пісталетам напагатове стаіць Мілан.

— Няма нікога, — упэўнена адказала жанчына.

— Добра. Аўфідэрзэен! — развітаўся афіцэр і пайшоў з хаты.

Жанчына з жахам глядзела на мужа, які, нібы ўкопаны, стаяў пасярод хаты. Нарэшце, ён зрабіў пару крокаў да яе. Вольга ўзняла руку, нібы баронячыся ад яго.

— Ты паслухай... — Пашка ступіў яшчэ адзін крок. — Я, каб цябе...

— Не падыходзь!

— Каб дзяцей...

— Не чапай дзяцей!

— Яны хацелі забіць цябе, забіць дзяцей... А што я мог зрабіць? Яны прымусілі... — глянуўшы на жонку, Пашка змоўк. Яна стаяла няўмольная, непахісная, як перад карай. І наступіла тая працяглая, пакутлівая паўза, якая, ясней за словы, гаварыла, што гэтыя людзі, якія нядаўна былі блізкімі і роднымі, сталі чужымі. Яны разумелі, што абарваны, абрэзаны ніці, якія звязвалі іх у сям'ю, і нішто не магло парадніць іх, нават дзеці.

— Як ты цяпер жыць будзеш?! — і гэта было не пытанне, а хутчэй роздум, развага, апошняе праяўленне клопатаў аб чалавеку, які нядаўна быў яе мужам.

Лена прыпала да акна і глядзіць на двор, дзе ляжыць забіты дзед Мікіта.

— Дзядуня, любы... даруй мне! — плача яна. Мілан узяў Лену за плечы і адвёў яе ад акна.

— Адыйдзіце, вас могуць убачыць.

— Як ён мог, як ён пасмеў...

— Ціха, ціха. Пастарайцеся супакоіцца, — Мілан наліў некалькі кропель лякарства і падаў Лене. — Выпіце.

— Мы ж яго ратавалі... За яго, за яго сям'ю Кузьма рызыкаваў жыццём, а ён... здрадзіў... Нягоднік! Гад паўзучы!.. — Лена не магла знайсці слоў, каб выказаць сваю нянавісць.

— Так, гэта нешта страшнае... недаступнае розуму...

— Я верыла яму... Я завяла яго да сваіх... А ён...

— Гэта слабы чалавек. Ён ратаваў сваіх дзяцей, сваю сям'ю, — няўпэўнена тлумачыў Мілан.

— Вы яго апраўдваеце? — здзівілася Лена.

— Не, што вы, што вы!... Вы толькі зразумейце мяне... У мяне ёсць маці. Я вельмі люблю яе. Яна для мяне самы дарагі чалавек... Я даўно пайшоў бы ў партызаны, разам з Дорыкам, разам з вамі. Але яны заб'юць яе... Я ненавіжу фашыстаў і ўсё ж... я вымушаны ім служыць...

Лена паглядзела Мілану ў вочы і ціха сказала:

— Тады мне лепей пайсці адсюль. Я стаўлю пад небяспеку і вас і вашу маці.

— Не, не. Вы не зразумелі мяне.—Мілан затрымаў Лену. — Вы пабудзеце тут да вечара. А калі сцямнее, я выведу вас за вёску. Цяпер я пайду на службу, а вы... абавязкова, чакайце мяне. Прашу вас, як сястру, не рызыкуйце.

У суседнім пакоі, каля акна, сядзіць Пашка. Вольга з дзецьмі — на ложку. Мілан выходзіць з свайго пакоя, замыкае дзверы. Выходзіць з хаты.

— Няўжо я і вас згубіў? — ціха гаворыць Пашка.

— Ні мне, ні дзецям не трэба такая ахвяра. Нас ніхто не апраўдае, — глуха, як на малітве, сказала Вольга.

— Мама, мне холадна,—скардзіцца дзяўчынка.

— І мне холадна, — хныкае і хлопчык.

— Пацярпіце, дзеткі,—Вольга ўхутвае іх коўдрай. — Вось я схаджу ў лес, прынясу дроў.

У хаце відаць, сапраўды холадна. Пашка, згорбіўшыся, сядзіць каля стала. Потым, нібы апрытомнеўшы, устаў, выйшаў на двор. Зняў вяроўку з крука на сцяне, узяў сякеру, упрогся ў самацяжкі і пайшоў са двара.

Панура апусціўшы галаву, Пашка цягне тачку па вуліцы. Непрыязнымі, варожымі позіркамі страчаюць і праводзяць яго аднавяскоўцы. Гэта бачыць, адчувае, разумее Пашка. Ён прыбаўляе крок, спяшаецца збегчы ад гэтых вачэй.

— Ка-ін! — крыкнуў нехта ўслед яму.

Пашка заходзіць у лес.

Звесіўся з тачкі і цягнецца па дарозе канец вяроўкі.

У лесе стаіць глухая цішыня.

Пашка спыніўся, задраўшы галаву, разглядае дрэва сухое, сукаватае.

— Ка-ін! Ка-ін! — сцёбае яго суровымі галасамі лясное рэха.

Мякка тарахціць па лясной дарозе павозка. На падводзе Кузьма і Дорык. Дорык паціху напявае чэшскую песенку.

Раптам конь спыніўся, фыркнуў, насцярожана застрыг вушамі. Кузьма выглянуў наперад: на дарозе стаяла тачка. Кузьма і Дорык саскочылі з павозкі, трымаючы напагатове зброю, падазрона азірнуліся вакол.

На дрэве вісіць чалавек.

Кузьма і Дорык пазналі Пашку.

— Якая няўдалая доля, — хмура філасофствуе Дорык. — І ад зямлі адарваўся і на неба не патрапіў.

— Значыць, ён выдаў іх, — здагадаўся Кузьма. — Хутчэй паедзем!

— Не спяшайся, Кузьма. Пакуль не сцямнее, мы не здолеем прабрацца ў вёску.

Вечарэла. Цемната паволі затушоўвала абрысы хат. На двор асцярожна выйшла Лена. Яна баязліва азірнулася кругом і завярнула ў свой двор. Падыйшла да дзеда Мікіты і ўпала на калені.

— Даруй, што я так цябе пакідаю... Даруй мне, дзядуня... — шаптала Лена, трымаючы ў руках халодны твар дзеда Мікіты.

У чорным праёме дзвярэй паказалася фігура старасты. Асцярожна ступаючы, ён падкраўся да Лены і схапіў яе ззаду за рукі.

— А-а, галубка, ты прыйшла ўсё-такі! — узрадаваўся ён.

— Пусці! Пусці! — адбівалася дзяўчына.

— Не, птушачка! Не магу я цябе адпусціць! — стараста заламаў Лене руку за спіну і выняў з кішэні пісталет.

Да іх падбегла Вольга.

— Пусці, гад! — Вольга кінулася на старасту.

Але той наводмаш ударыў Вольгу рукояткай пісталета па галаве, і Вольга распласталася на зямлі.

У імправізаваным прыёмным пакоі сядзіць Мілан і час-ад-часу паглядае на гадзіннік.

У дзверы пастукалі.

— Заходзьце.

Уваходзіць унтэр-афіцэр Войцех.

— А, Войцех! Заходзь. Захварэў?

Войцех не спяшаецца з адказам.

— Што непакоіць?

— Многае. Начамі не сплю.

— Распранайся.

Войцех неахвотна распранаецца.

Мілан пачынае выслухоўваць пацыента.

— Дыхайце...

Калі Мілан схіліўся да яго з трубкай, Войцех зашаптаў.

— Сярод забітых партызан апазналі нашага таварыша.

— Ведаю.

— Гюнтэр сам дапытвае ўсіх салдат. Ён упэўнены, што мы звязаны з партызанамі. Калі мы не адважымся сёння, заўтра будзе позна.

— Што ты прапануеш?

— Ісці ў лес.

— Нашым сем'ям пагражае небяспека, расправа.

— Ведаю. Гэта ж нам гавораць і нацысты. Каб запалохаць нас. Але зразумейце, наша пакаленне павінна быць самаахвярным, калі мы хочам назаўсёды вызваліць свае сем'і ад небяспекі.

Мілан задумаўся.

— Калі мы не баязліўцы, у нас другога выбару няма, — сказаў Войцех.

— Ты камуніст?

— Пакуль што не.

Пастукалі ў дзверы. Увайшоў пасыльны.

— Пан доктар, вас выклікае Гюнтэр.

— Добра.

— Вам пісьмо з дому, — пасыльны аддаў пісьмо і выйшаў.

Мілан чытае пісьмо. Войцех апранаецца.

— Пісьмо ад маці, — паведаміў Мілан.

У сельскай школе размясціўся нямецка-паліцэйскі гарнізон. У адным з класных пакояў сядзіць сярдзіты Гюнтэр.

— Дзе гэты доктар? Дзе гэты чэх? — пытае ён унтэр-афіцэра, які стаіць каля дзвярэй, як статуя.

— Па яго паслалі, — адказаў унтэр.

Перад Гюнтэрам на падлозе ляжыць у непрытомнасці пасля катаванняў Лена.

У дзвярах паяўляецца Мілан.

— Доктар? — пытаецца Гюнтэр.

— Так.

— Паглядзіце, — загадвае Гюнтэр Мілану, кіўнуўшы галавой на Лену.

Мілан падыходзіць да Лены, глянуў на яе, потым павольна перавёў вочы на Гюнтэра. Мілан не разумее: што гэта—допыт ці вочная стаўка.

— Ты што стаіш? Паглядзі яе і, калі ты доктар, зрабі, каб яна загаварыла.

Мілан схіліўся над Ленай, узяў яе руку, паслухаў пульс.

— Ёй патрэбна ін'екцыя... вельмі слабы пульс.

— Зрабі! — дазволіў Гюнтэр.

— Я не маю з сабой медыкаментаў, — прызнаўся Мілан.

— А якога чорта ты сюды ішоў?! — раззлаваўся Гюнтэр. — Быстра!

Мілан паспешна выйшаў з пакоя.

Гюнтэр уздыхнуў ад стомы, пацёр скроні і загадаў унтэр-афіцэру:

— Пільнуйце за гэтым чэхам. Як прывядзе яе да прытомнасці, даставіш яе да мяне ў гестапа. Я вельмі стаміўся, — Гюнтэр выйшаў.

Праз мінуту на вуліцы затарахцеў матор, і машына з Гюнтэрам паехала.

Унтэр-афіцэр сеў на месца Гюнтэра і абыякавым поглядам уставіўся на нерухомае цела дзяўчыны.

На ганку, перад уваходам у школу сумуе вартавы.

З цемнаты паяўляюцца дзве фігуры.

— Хальт! Вэр комт! — аклікнуў вартавы.

— Дас іст артцліхе хільфе, — адказаў Мілан.

— Біттэ, — дазволіў вартавы і адчыніў перад Міланам дзверы.

Як толькі Мілан прайшоў у калідор, Дорык, які суправаджаў яго, схапіў вартавога і заціснуў яму рот. Бліснула лязо кінжала. А праз момант на ганку былі ўжо Кузьма і Войцех. Войцех заняў месца вартавога. А Кузьма падбег да Лены, якой Мілан ужо аказваў першую дапамогу.

Лена апрытомнела, адкрыла вочы і пазнала Мілана і Кузьму. На твары з'явілася слабая ўсмешка радасці.

— Я ведала, што ты прыйдзеш, — сказала яна Кузьме. — Ты прыйшоў... — потым павярнула галаву да Мілана. — І ты, Мілан, ідзі з імі. Маці... каб тваёй маці было... — прашаптала яна і зноў страціла прытомнасць. І цяпер ужо назаўсёды.

Гэта зразумеў Мілан. Гэта зразумеў і Кузьма.

Кузьма схіліўся над Ленай, падняў яе на рукі. ланёс...

ПЕСНІ ГЕРОЯЎ НЕЎМІРУЧЫЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

акампаніруе на гітары, такі спакойны?

Раптам спявак працягнуў рукі і з пранікнёнасцю кінуў у залу словы... «Что ж вы, братцы, приуныли». Слухачы адказалі такімі апладысментамі, якіх не заўсёды пачуеш на канцэртах выдатных артыстаў. Зала зразумела спевака. Толькі паліцаі ды бургамістр хмурацца. А потым спявалі вясёлую, задорную «Мяцёлкі вязалі». Хтосьці са здраднікаў ускочыў, калі спявак, шырока ўсміхаючыся, лёгка і радасна спяваў «Мяцёлкі вязалі, у Маскву адпраўлялі... ад Масквы адмяталі». Калі каменданту пераклалі словы песні, Акаёмава пакаралі.

Яшчэ сёння жыхары Крычава з любоўю ўспамінаюць канцэрты Акаёмава.

Аднойчы артыстаў і Кулішава па чарзе выклікаў да сябе нейкі вялікі нямецкі чын. Ён прапанаваў стварыць фашысцкую газету на рускай мове, а артыстам і Кулішаву супрацоўнічаць у гэтай газеце. Калі яны не хочуць ствараць такую газету ў Крычаве, дык ім створаць умовы ў Магілёве. Жыць будуць прыпяваючы.

Афіцэр паехаў з Крычава раз'юшаны. Артысты і Кулішаў не далі згоды, нягледзячы на пагрозы. Яны ж ніколі не працавалі ў газеце. Была адхілена і прапанова стварыць ансамбль для нямецкіх войск у Магілёве або ў іншым вялікім горадзе. Становішча артыстаў усё пагаршалася. Але яны не пакідалі работу. У Акаёмава быў схаваны ў мясцовага жыхара старэнькі радыёпрыёмнік. Ён рэгулярна слухаў Маскву і запісваў зводкі Савінфармбюро.

Аднойчы ўвечары, калі гаспадары дома пайшлі да суседзяў, Акаёмаў і Лузенін асцярожна дасталі прыёмнік. Вось і Масква. Знаёмы голас Левітана, зводка Савецкага Інфармбюро. Ці даўно яны ў будынку Маскоўскага радыё ледзь не кожны дзень сустракаліся з Левітанам. І вось цяпер іх падзяляюць сотні вогненных кіламетраў. Дыктар аб'явіў аб пачатку канцэрта па заяўках воінаў.

«Па просьбе групы танкістаў, што змагаюцца на Сталінградскім фронце, перадаём песню «Арлёнак» у выкананні артыста...»

Аляксандр Іванавіч слухаў нейкі момант, потым абхапіў галаву рукамі і пахіснуўся. Ён увесь згорбіўся, нібы на плечы лёг тысячапудовы груз. Якое страшэннае выпрабаванне, якія цяжкія хвіліны! Там, у Маскве, для герояў Сталінграда перадаюць яго любімага «Арлёнка» ў яго выкананні. Там, у Маскве, пад Сталінградам, не ведаюць, што ён тут, у варожым палоне, употайку слухае свой голас.

Пасля гэтага Аляксандр Іванавіч стаў менш асцярожны. Сабраўшы моладзь, ён запэўняў яе, што хутка прыйдзе Чырвоная Армія. Пра гэта данёс гестапаўцам поп. Але фашысты спадзяваліся на тое, што ўдасца знайсці сляды падпольнай арганізацыі. І яны знайшлі. Уся падпольная група была арыштавана. Пачаліся лютыя катаванні. У лагеры быў арыштаваны сталінградзец Васіль Кузьмін і яшчэ два невядомыя таварышы, якія кіравалі падрыхтоўкай паўстання ваеннапалонных. Акаёмаў, Лузенін, Кулішаў дапытваліся асобна, у тайнай палявой паліцыі. Двое невядомых загінулі на допыце. Кулішаў увесь паколаты іголкамі, Кузьмін цяжка збіты, Лузенін быў непазнавальны, твар счарнеў ад пабояў. Калі яго і Акаёмава вялі з допыту, Лузенін убачыў на тратуары мясцовых жыхароў. Жанчыны плакалі. Яны ўбачылі згорбленага Акаёмава, у якога была зламана правая рука.

Раніцаю крычаўскія дзеці, якія спявалі ў хоры з Лузеніным і Акаёмавым, сабралі подпісы і адна дзяўчына пайшла з гэтым лістом паперадзе дзяцей у камендатуру. Дзяўчыну выгналі з камендатуры, а дзецям прыгразілі расправай. З плачам адыходзілі яны ад ганка варожага логава. А ўначы дзіцячымі рукамі на агарожах крэйдаю былі напісаны словы: «Свабоду Кулішаву і артыстам!»

Допыты працягваліся. Ніхто нічога не сказаў аб падрыхтоўцы паўстання ў лагеры. Немцы ўжо расстралялі каля двухсот чалавек палонных, але так і не маглі знайсці нічога. Людзі паміралі і неслі з сабою ў магілы тайну.

Асабліва заўзята катавалі фашысты і паліцаі артыстаў. Ім задавалі адны і тыя ж пытанні: «Як вы звязаліся з дэсантнікамі ў чэрыкаўскіх лясах? Дзе рацыя? Раскрыйце вашы сувязі ў горадзе Чэрыкаве, куды вы часта ездзілі на канцэрты?» Значыць, ворагі ведалі нешта не толькі пра сувязь артыстаў з крычаўскім падполлем. Яны даведаліся больш. Толькі ў іх былі няпоўныя дадзеныя. Гестапаўцы хацелі даведацца, каму перадавалі сабраныя разведвальныя дадзеныя Акаёмаў і Лузенін у Крычаве. Марыя Таўкачова ведала пра ўсё гэта, але яна не пайшла з Крычава. Яна спадзявалася, што масквічы вытрымаюць катаванні.

Аднойчы, ідучы з допыту, Акаёмаў паспеў сказаць адной з сувязных: «Нас выдалі не толькі ў Крычаве, але хтосьці выдаў і ў Чэрыкаве пасля арышту».

Падпольшчыкі вырашылі ўцякаць. Дванаццацігадовы падпольшчык Віця Дудзін перадаў у турму гранату, пісталет і кінжал. Зняволеныя, сабраўшы сілы, спявалі працяжную песню «Эх, ты доля, мая доля...». Акаёмаў і Лузенін былі пасаджаны ў асобныя камеры, хоць усе астатнія падпольшчыкі сядзелі дзвюма вялікімі групамі. Напэўна, немцы ўсё яшчэ спадзяваліся раскрыць сувязі артыстаў, падсаджваючы да іх здраднікаў.

Надыйшла ноч, калі падпольшчыкам удалося адчыніць дзверы камер. Прапанавалі ўцякаць і артыстам. Аляксандр Іванавіч толькі горка ўсміхнуўся. Ён не мог нават утрымаць у руках кубак з вадою. Акаёмаў сказаў, што яму ўжо не бачыць свабоды, а таварышам пажадаў шчасця. Лузенін таксама быў цяжка збіты. Ён астаўся з Аляксандрам Іванавічам. З тых, хто ўцякаў, загінулі толькі двое: Кузьмін і Кулішаў. Яны былі злоўлены і расстраляны.

Артыстаў павезлі на расстрэл раніцаю, пасля ўцёкаў. Гэта было 21 лютага 1943 года, на беразе Чорнага возера, каля вёскі Прудок, непадалёку ад дома Е. Цярэнцьевай, якая ведала Акаёмава і Лузеніна і бачыла ўсю страшэнную сцэну расстрэлу.

Хутка ў Крычаў, на братнюю магілу, куды перанесены астанкі А. Акаёмава і Г. Лузеніна, прыедуць іх землякі — дэлегацыі Пермі і Разані, а таксама відныя дзеячы мастацтва і культуры сталіцы нашай Радзімы — Масквы. У Маскве адбудзецца вечар памяці герояў.

Як ля брацкай магілы ў Крычаве, так і ў Маскве прагучаць песні ў выкананні А. Акаёмава і хору пад кіраўніцтвам Г. Лузеніна, запісы якіх захаваліся. Лепшыя артысты сталіцы нашай Радзімы дадуць у гарадах Крычаве і Магілёве канцэрты, прысвечаныя памяці артыстаў-герояў, якія загінулі ў барацьбе з фашызмам на палях Беларусі.

М. МЕЛЬНІКАЎ,
краязнаўца.

ПРА НЕЗАБЫЎНЫЯ ДНІ

...Чуваць асобныя дружныя залпы. З зацямнення павольна ўзнікаюць руіны старадаўняга нямецкага дома і адзінокая постаць чалавека. Ён сядзіць да нас спіною. На ім падраная ватоўка. Здаецца, што чалавек спіць. Але ён тут не адзін: непадалёку гвардыі старшына Шакро Шаўгулідзе перакладвае ў сваіх куфэрках няхітрую салдацкую гаспадарку. «Дзядзя Шакро», як любоўна называюць яго байцы, пачынае гаворку з невядомым... І вось перад тэлегледачамі паступова раскрываецца трагічны лёс юнака з Ленінграда, якому так і не ўдаецца сустрэцца са сваёй каханай. Ён гіне ў жорсткай схватцы з фашыстамі літаральна за некалькі хвілін да капітуляцыі гітлераўскага райха...

Мы расказваем пра п'есу С. Гансоўскага «На паўночны захад ад Берліна». Яна паслужыла асновай для аднайменнага тэлевізійнага спектакля Мінскай студыі тэлебачання, прэм'ера якога прысвечана Дню Перамогі над фашысцкай Германіяй. У п'есе паказаны вобразы простых савецкіх людзей, непрыкметных герояў нашай перамогі над захопнікамі. П'еса С. Гансоўскага атрымала першую прэмію Усесаюзнага конкурсу на лепшую аднаактовую п'есу да 40-годдзя Ленінскага камсамола.

Рэжысёр тэлеспектакля «На паўночны захад ад Берліна» Ус. Кухта. Аператары — В. Свіракін і В. Савіцкі. Мастак — М. Карпук. У галоўных ролях тэлеспектакля выступаюць акцёры І. Ражба, Я. Карнавухаў, В. Багалюбскі, Н. Семянцова і С. Пушкіна.

На здымку: кадр з тэлевізійнага спектакля «На паўночны захад ад Берліна». Разведчык Чорны — артыст **В. Багалюбскі**, Таня Кулікава — артыстка **Н. Семянцова**.

Фота **Э. Яскевіча.**

Для музея Брэсцкай крэпасці

Велічны подзвіг абаронцаў Брэсцкай крэпасці прыцягнуў да сябе ўвагу многіх ваенных мастакоў. На месцах легендарных баёў пабывалі і стварылі запамінальныя творы аб мужнасці савецкіх салдат і афіцэраў заслужаны дзеяч мастацтва РСФСР П. Крываногаў, Н. Бут, Ю. Іваноў і рад іншых мастакоў і скульптараў студыі імя М. Грэкава.

Ю. Іваноў у 1957 г. закончыў работу над кампазіцыяй «Героі Брэста». Цікава адзначыць: перш, чым скульптар выбраў канчатковы варыянт сваёй работы, ён зрабіў больш дзесяці эскізаў. Скульптурная група экспанавалася на выстаўках у Маскве, а цяпер устаноўлена ў Музеі абароны Брэсцкай крэпасці.

Скульптара вабіць тэма абароны цытадэлі над Бугам. Ю. Іваноў закончыў другую сваю значную работу для музея — «Пачатак Вялікай Айчыннай вайны».



Новы твор прысвечаны барацьбе савецкага народа супраць гітлераўскіх захопнікаў, паказу кіруючай ролі Камуністычнай партыі ў арганізацыі абароны Айчыны. У цэнтры рэльефа — фігура камісара са сцягам у руцэ, побач байцы розных родаў войск, прадстаўнікі розных нацыянальнасцей, якія аднолькава горача любяць сацыялістычную Радзіму, гатовыя дзеля яе стаяць насмерць. Усе яны адлюстраваны ў руху, удала падкрэсліваецца напружанасць моманту. Рэльеф зроблены з таніраванага гіпсу.

Майстар разца задумаў стварыць барэльеф Холмскіх варот Брэсцкай крэпасці. Ім зроблена некалькі эскізаў у пласціліне.

— Якія вашы творчыя планы? — пацікавіліся мы ў Ю. Іванова.

Вось што ён расказаў:

— Думаю працаваць над бюстам слаўнага патрыёта Героя Савецкага Саюза Д. М. Карбышава, чыё імя непарыўна звязана з гісторыяй Брэсцкай крэпасці. «Была вайна» — так мяркую назваць яшчэ адзін свой будучы твор.

У Брэсце маскоўскі скульптар выступаў у Доме афіцэраў з лекцыяй «Вобраз Ул. І. Леніна ў творчасці ваенных мастакоў», прыняў актыўны ўдзел у гарадскім сходзе культасветработнікаў. Па прапанове Ю. Іванова пры гарадскім камітэце партыі створан мастацкі савет, у функцыі якога ўваходзіць кантроль за афармленнем горада.

На здымку: Ю. Іваноў на эцюдах у Брэсцкай крэпасці.

Тэкст і фота **Ул. Фрэйдзіна.**

Наша паездка ў Маскву

Тэатр імя Янкі Купалы за апошнія пяць год паставіў чатыры спектаклі, прысвечаныя жыццю і дзейнасці Уладзіміра Ільіча Леніна: «Сям'я» І. Папова, «Крамлёўскія куранты» М. Пагодзіна, «Вечная крыніца» Д. Зорына, «Грозны год» А. Каплера. У трох з гэтых спектакляў вобраз Ул. І. Леніна быў створаны народным артыстам СССР П. Малчанавым.

У 1958 г. тэатр падрыхтаваў спектакль па п'есе М. Пагодзіна «Трэцяя патэтычная». Ставіў яго малады здольны рэжысёр Б. Эрын. Выкананне вобраза Леніна было даручана народнаму артысту СССР Б. Платонаву. Спектакль прайшоў больш шасцідзесяці разоў. Крытыка адзначала, што галоўныя яго якасці — палымянасць, мэтанакіраванасць і вялікі аптымізм. Гледачы палюбілі гэты твор.

Адзначаючы 90-годдзе з дня нараджэння Ул. І. Леніна, тэатр арганізаваў дэкаду паказу спектакляў з вобразам Ул. І. Леніна. Вялікай падзеяй у творчым жыцці калектыву была паездка ў Маскву са спектаклем «Трэцяя патэтычная» ў гэтыя дні. У сустрачы з патрабавальнымі гледачамі сталіцы яшчэ раз правяралася майстэрства калектыву, трымаўся экзамен на сталасць.

Б. Платонаў, выканаўца ролі Леніна, пакарыў гледачоў праўдзівасцю створанага ім вобраза, паўнатой пачуццяў і глыбінёю ўнутраных перажыванняў. Таксама высока была ацэнена творчая работа Л. Рахленкі, стваральніка вобраза капіталіста Гвазздзіліна. Вялікім поспехам карысталіся Б. Кудраўцаў, З. Браварская, А. Бараноўскі, Т. Аляксеева, А. Рынковіч і інш.

На абмеркаванні, агранізаваным Міністэрствам культуры СССР, было сказана многа сардэчных слоў, дадзена ацэнка акцёрскай і рэжысёрскай рабоце. Мы выслухалі дзелавую сяброўскую крытыку.

Ул. Піменаў гаварыў, што спектакль з вобразам Леніна — творчая перамога купалаўцаў, якія стварылі цікавы ансамблевы спектакль.

Рэжысёр МХАТ'а І. Раеўскі падрабязна прааналізаваў творчую работу калектыву старэйшага беларускага тэатра. Ён гаварыў, што мхатаўцы вельмі ўважліва сочаць за ростам і развіццём калектыву. Спектакль пакарыў ансамблевасцю, акцёрскім майстэрствам, сталасцю і навізной. Радуе многіх тое, што разам з майстрамі расце новае пакаленне моладзі.

Аналізуючы рэжысёрскую задуму Б. Эрына ў спектаклі «Трэцяя патэтычная», І. Раеўскі сказаў, што рэжысёр смела і востра вырашае спектакль як мэтанакіраваную, маштабную патэтычную сімфонію. Вось чаму ён атрымаўся дынамічны і хвалюючы. Музыка старэйшага беларускага кампазітара Я. Цікоцкага, афармленне мастака А. Грыгар'янца зліліся ў адзіным рэжысёрскім вырашэнні спектакля Б. Эрыным.

Начальнік Упраўлення па справах мастацтва Міністэрства культуры СССР Г. Осіпаў адзначыў, што поспех тэатра ў Маскве не выпадковы. Яго задаволіла работа Б. Платонава ў вобразе Ул. І. Леніна. Б. Платонаў, на думку прамоўцы, дастойны прадаўжальнік лепшых традыцый выдатнага рускага акцёра Шчукіна, аднаго з першых выканаўцаў ролі Леніна.

Народны мастак РСФСР Б. Кноблок прааналізаваў прынцып вырашэння спектакля рэжысёрам Б. Эрыным і мастаком А. Грыгар'янцам. Ён сказаў, што ў задуме пастаноўшчыкаў — многа новага, цікавага. Работа мастака вельмі цікавая, але не ўсё аднолькава добра ў афармленні. Ёсць рад сцэн, не даведзеных да вялікага гучання (кватэра Сестрарэцкіх). Варта падумаць і пра лепшае афармленне фінальнай сцэны.

Сустрэча з тэатральнай грамадскасцю Масквы і абмеркаванне спектакля натхнілі калектыў тэатра, каб з яшчэ большай энергіяй узяцца за падрыхтоўку новых сучасных пастановак.

Ідуць апошнія рэпетыцыі п'есы В. Зуба «Зловацца не трэба».

Тэатр прыняў да пастаноўкі новую п'есу А. Маўзона «Калі ты чалавек».

Рэжысёр Л. Рахленка да заканчэння сезона рыхтуе новы спектакль «Востраў Афрадзіты» А. Парніса. Прэм'ера намечана к канцу чэрвеня.

Цяпер, апроч падрыхтоўкі і выпуску двух новых спектакляў, купалаўцы рыхтуюцца да гастролей у Адэсе.

Гастролі на Украіне будуць прысвечаны надыходзячаму 40-годдзю Тэатра імя Янкі Купалы. Мы намячаем, апроч паказу на гастролях лепшых спектакляў нашага рэпертуару, арганізаваць на фабрыках, заводах, у дамах культуры, калгасах і саўгасах творчыя сустрэчы майстроў тэатра з рабочымі і калгаснікамі Украіны. Мы маем намер правесці цыкл лекцый, дакладаў на тэму аб развіцці беларускага нацыянальнага тэатральнага мастацтва, аб творчасці майстроў беларускай сцэны, аб росце і развіцці нашай драматургіі.

А. ЦЕЛІЧАН,
дырэктар Тэатра імя Янкі Купалы.

Застава, якой камандуе Пётр Паўлавіч Салява, каля трох год утрымлівае ганаровае званне выдатнай заставы. Яна ўзнагароджана пераходным Сцягам часці. Многія воіны тут — выдатнікі баявой і палітычнай падрыхтоўкі, спартсмены-разраднікі, умелыя следапыты. Выдатнымі поспехамі ў службе і вучобе сустракаюць яны Дзень перамогі. Лепшых паказчыкаў дамаглося аддзяленне, якое ўзначальвае сакратар камсамольскай арганізацыі сяржант Валянцін Фёдараў. Вопытны выхавацель салдат, узнагароджаны знакамі «Выдатны пагранічнік» і «Выдатнік Савецкай Арміі», камуніст Фёдараў вывеў сваё аддзяленне на першае месца, заваяваўшы пераходны вымпел заставы.

На здымку (злева направа): капітан **П. Салява**, сяржант **В. Фёдараў** і малады салдат **М. Камелаў** у нарадзе на граніцы.

Фота **Н. Бараўкова.**
(Фотахроніка БЕЛТА).

Памяці Марка Твена

Беларускі рэспубліканскі камітэт абароны міру, літаратурная секцыя Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі і Саюз пісьменнікаў БССР наладзілі 5 мая г.г. у Мінску ўрачысты вечар, прысвечаны памяці выдатнага амерыканскага пісьменніка Марка Твена.

З уступным словам выступіў пісьменнік Іван Грамовіч. Паэт-перакладчык Язэп Семяжонаў зрабіў даклад пра творчасць і жыццё М. Твена.

Загадчык кафедры англійскай мовы Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна С. Дорскі прачытаў два апавяданні М. Твена ў новым перакладзе на беларускую мову. Студэнты БДУ прачыталі вусна і ў сцэнічным выкананні некалькі твораў пісьменніка.

Вечар быў змястоўны і цікавы.

ПА СТАРОНКАХ ДРУКУ

Шчырае слова сяброў

Ілюстраваны часопіс «Мастацтва ў Румынскай Народнай Рэспубліцы», які выходзіць два разы ў год у Бухарэсце, нядаўна змясціў (№ 18, 1959) артыкул «Беларускае выяўленчае мастацтва». У часопісе друкуюцца рэпрадукцыі работ К. Касмачова («Напярэдадні»), А. Бембеля («Радзіма»), Я. Харытоненкі («Хлопчык з кнігай»), Я. Раздзялоўскай («Раніца»), А. Паслядовіч («Вясна»).

Мастацтвазнаўца Амелія Павел падкрэслівае асаблівую цікавасць румынскага гледача да выстаўкі беларускага выяўленчага мастацтва, якая была наладжана ў Бухарэсце ў Дні беларускай культуры і мастацтва ў Румыніі. Румынскі глядач, зазначае аўтар артыкула, пераканаўся, што «беларускае мастацтва займае ганаровае месца ў ансамблі савецкай мастацкай творчасці».

Амелія Павел падкрэслівае такія адметныя рысы беларускага выяўленчага мастацтва, як «выключная жывасць пластычнага выяўлення», «тэмпераментнасць мастацкай мовы аўтараў», «вялікая жыццярадаснасць», «жаданне ахапіць усе бакі рэчаіснасці, якая пастаянна абнаўляецца». «Характэрна для гэтага жывапісу, — гаворыць аўтар артыкула, — вострая ўспрыймальнасць да фарбаў, да магутнасці і прыгажосці форм».

Падкрэсліваючы як вельмі характэрнае для беларускага жывапісу — схільнасць беларускіх мастакоў да жывапіснай аповесці і біяграфічнага партрэта жанравага тыпу, румынскі мастацтвазнаўца бачыць у беларускім выяўленчым мастацтве «багацце мастацкага вопыту» і «самабытную канцэпцыю тэматычнага жывапісу». «Спалучаючы цікавы эпізод з імкненнем расказаць пра яго спецыфічнымі жывапіснымі сродкамі, беларускія мастакі здолелі стварыць шэраг цудоўных кампазіцый», — піша Амелія Павел і спасылаецца на такія палотны, як «У балотах Беларусі» Стасевіча, «Маладыя мінскія будаўнікі» Стальмашонка, «Абаронцы Брэсцкай крэпасці» Ахрэмчыка, «Студэнтка» Савіцкага. Высокая ацэнка дадзена крытыкам рабоце К. Касмачова «Напярэдадні».

Гаворачы аб партрэтным жанры, мастацтвазнаўца ўспамінае «Паэзію ўзросту» Харытоненкі і «Раніцу» Раздзялоўскай — «партрэты, самыя назвы якіх указваюць на іх прыналежнасць да жанра, што пацвярджаецца і апавядальным характарам гэтых работ, у якіх, між іншым, зусім адсутнічае элемент падзеі».

Што датычыць скульптуры, то крытык лічыць яе адметнымі бакамі тэмпераментнасць, сілу, шчырасць, асабліва відавочныя ў такіх майстроў, як Азгур і Бембель. «І ў «Партрэце лётчыка Гастэлы», і ў яго праекце помніка «Радзіма» вопытны мастак Бембель здолеў ясна перадаць легендарныя подзвігі і — карыстаючыся ўрачыстай, але зусім не суровай сімволікай і формамі, якія трапечуць жыццём, — багацце ідэйнага зместу. У другіх скульптараў, як напрыклад у Мурамцава, можна назіраць пераважную схільнасць да дэталёвага аналізу і псіхалагічных нюансаў. Мы маем на ўвазе яго «Партрэт жанчыны», выкананы асабліва старанна».

Высокая агульная ацэнка даецца ў артыкуле і беларускай графіцы. Як прыклады Амелія Павел называе гуашы Паслядовіч: «Вясна» і «Восень». Творы беларускіх графікаў, піша крытык, апроч сваёй мастацкай каштоўнасці, «уяўляюць неаспрэчную цікавасць як сапраўдныя, хоць і бегла запісаныя дакументы сучаснасці».

Б. РАНІН.

ЧАЛАВЕК АДВАГІ

Кароткая каманда «Узлёт!» — і самалёт Уладзіміра Харытонава ўзяў курс на палігон...

Уладзіміру Міхайлавічу добра вядомы мірныя і ваенныя палёты. Яго лётная біяграфія пачалася ў чэрвені 1941 г., калі ён скончыў авіяцыйную школу пілотаў. А праз тыдзень фашысцкія полчышчы ўварваліся на нашу зямлю.

Весткі з фронта прыходзілі трывожныя. Уладзімір імкнуўся хутчэй трапіць на фронт, але яго не адпускалі. На ўзбраенне паступіў грозны «ільюшын», і групе маладых пілотаў, у лік якой уваходзіў Харытонаў, прадстаяла вывучыць новую баявую машыну. Начамі Харытонаў доўга ляжаў у пасцелі з адкрытымі вачыма, і яго думкі былі ў невялічкім гарадку Порхаве, куды дакацілася фашысцкая навала, дзе засталіся маці і сястрычка Ліда. «Што з імі, які іх лёс?» — сціскалася сэрца ад болю.

— Пакуль не асвоіце новую машыну, пра фронт і не думайце, — казаў камандзір запаснога палка.

Толькі ў пачатку 1942 г. старшы сяржант Харытонаў быў залічаны ў дзеючую армію. Уладзімір з першага дня адчуў сябе паўнапраўным членам баявой сям'і, пасябраваў з лётчыкамі, стаў у палку «сваім» чалавекам.

І вось першы баявы вылет. Хіба забудзецца хваляванне перад атакай?

Праходзяць хвіліны. Унізе шугае полымя, гараць разбураныя вёскі. Вядучы дае каманду падрыхтавацца да атакі. Харытонаў заўважае на шашы калону варожых машын. Разам з таварышамі ён абрушвае на фашыстаў агонь гармат і бомбы.

Камандзір, адзначаючы ўмелыя дзеянні маладога лётчыка, пахваліў яго, але тут жа зазначыў:

— Толькі не зазнавацца.

І праз некалькі дзён Харытонаў паспытаў «ягадак».

У той дзень была нізкая дзесяцібальная воблачнасць, густая дымка. На адну з чыгуначных станцый прыбылі гітлераўскія эшалоны з боепрыпасамі. Палку была пастаўлена задача — пазбавіць ворага падмацавання.

Адзін за адным падымаюцца ў паветра штурмавікі. Не прайшло і хвіліны, як спераду, з бакоў і ззаду «ільюшыных» навіслі «чорныя шапкі». Гэта стралялі зяніткі. Харытонаў рэзка ўзняў машыну ўгару, потым зрабіў левы разварот і, слізгаючы на крыло, заўважыў варожую батарэю. Вось ужо відаць чорнаплямістая расфарбоўка на шчыце гарматы і салдаты ў зялёных касках. Лётчык адкрыў агонь.

Эскадрылля штурмавікоў граміла чыгуначныя саставы і ачмурэлых ад страху гітлераўцаў. І раптам па праваму борту машыны Харытонава маланкай бліснула траса. Трэснуў ліхтар кабіны. «Усё, адваяваўся!» — мільганула страшэнная думка. Харытонаў сціснуў штурвал і з сілаю ўпёрся нагамі ў педалі, нібы гэта магло дапамагчы параненай машыне павялічыць хуткасць. Дым ішоў мацней. Стрэлка прыбора няўмольна паказвала падзенне вышыні. Самалёт зваліўся ў балота. Зыбкая глеба зменшыла сілу ўдара, і гэта выратавала лётчыку жыццё.

Апрытомнеўшы, Уладзімір пачаў дзейнічаць. Адламаўшы ад ліхтара кабіны кавалак плексігласа, пачаў рабіць падкоп. Праз гадзіну-паўтары яму ўдалося з цяжкасцю вылезці з-пад самалёта. Высунуўшы галаву, Уладзімір убачыў, што знаходзіцца паміж нямецкімі і сваімі акопамі. Раздумваць не было калі. Фашысты маглі напасці кожную хвіліну, і Уладзімі папоўз у бок сваіх. А насустрач яму спяшаліся ўжо тры салдаты ў маскіровачных халатах. Як потым высветлілася, савецкія воіны некалькі разоў спрабавалі прабрацца да самалёта, але гітлераўцы адкрывалі моцны агонь, і яны вымушаны былі вяртацца назад.

Пехацінцы цёпла прынялі лётчыка, накармілі і дапамаглі дабрацца ў полк.

— Харытонаў!—радасна ўсклікнуў камандзір палка. — Ды мы ж лічылі, што ты загінуў! Вось і вінішую цябе з сапраўдным баявым хрышчэннем.

Гэты выпадак быў не адзіным у баявым жыцці Харытонава. Чатыры разы збівалі яго варожыя зенітчыкі, двойчы — знішчальнікі. Але часцей бітым аказваўся вораг. Фашысты не раз адчувалі на сабе сілу моцных удараў Харытонава.

Аднойчы Харытонаў са сваім баявым таварышам штурманам Аскарам Джандаравым вылецеў на разведку камунікацый праціўніка. Адразу ж за лініяй фронта перайшлі на брыючы палёт і праніклі такім чынам у тыл амаль на сто кіламетраў. Ён наляцеў на варожы аэрадром. На старце стаяў гатовы да ўзлёту самалёт. На яго Харытонаў абрушыў агонь сваіх гармат.

Перадаўшы на КП дадзеныя аб разведцы, Харытонаў узяў курс «дадому». Падлятаючы да лініі фронта, ён заўважыў сем «юнкерсаў», якія ішлі да нашага пярэдняга краю. Уладзімір, не задумваючыся, кінуўся на ворага. Дзёрзкая атака штурмавіка ашаламіла гітлераўцаў. У паніцы яны некаторы час не адкрывалі агню па чырвоназорнай машыне. Трапнай чаргою Харытонаў запаліў вядучы самалёт. Баявы парадак групы быў парушаны. Гітлераўцы пачалі хутка скідваць бомбы і ўцякаць. Харытонаў збіў яшчэ аднаго «юнкерса».

За гэты выліт адважны лётчык быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. А на наступны дзень пра яго подзвіг даведалася ўся краіна: пра гэта паведаміла Савецкае Інфармбюро.

265 баявых вылетаў зрабіў лётчык Уладзімір Харытонаў. Мужнасць і стойкасць ніколі не пакідалі яго. Шмат смелых палётаў зрабіў ён у баях за вызваленне Беларусі. У той час камандаванню фронта неабходна было мець яснае ўяўленне аб колькасці і характары абаронных збудаванняў гітлераўцаў. Такія звесткі магла даць толькі аэрафотаразведка. Гэтае адказнае заданне было даручана экіпажу старшага лейтэнанта Харытонава. Трынаццаць разоў падымаўся ў паветра бясстрашны лётчык. Над зямлёю, з якой, здавалася, страляе кожны куст, лётчык-разведчык у смяртэльнай небяспецы выконваў баявыя заданні.

Мужнасць савецкага лётчыка прыводзіла ў шаленства гітлераўцаў. Неяк над «ільюшыным» Харытонава павісла адразу звыш ста шапак разрываў. У другі раз фашысты выпусцілі шасцёрку «месершмітаў». Чатыры з іх трымаліся ў хвасце, а два няспынна заходзілі з бакоў, імкнучыся ўдарыць па матору. Харытонаў рэзка адыходзіў угару або ўніз, ныраючы іншы раз да самага дна просек у лясных масівах. «Месеры» праскаквалі, а разведчык зноў працягваў выконваць сваю небяспечную, але такую важную для камандавання работу.

Толькі калі асколак снарада трапіў у масляны радыятар, Харытонаў спыніў фотаздымку. На параненай машыне ён, адбіваючыся ад гітлераўцаў, пераляцеў лінію фронта і прызямліўся на сваёй тэрыторыі.

Адпачыўшы, Харытонаў зноў падымаецца ў неба. Ён атакуе аўтакалону. Спаліў дзесяць машын з жывой сілай праціўніка.

Праз некалькі дзён перад камандуючым фронта ляжала вялікая фотакарта, якая раскрывала тайны фашысцкага звера, а яшчэ праз некалькі гадзін, дзякуючы дадзеным разведкі Харытонава, загаварыла савецкая артылерыя, рушылі ў атаку танкі, падняліся ўгару сотні чырвоназорных машын, каб магутным ударам выкінуць гітлераўцаў з межаў Беларусі, наблізіць доўгачаканы дзень перамогі.

Напярэдадні 27-й гадавіны Савецкай Арміі, калі Уладзімір і яго таварышы грамілі фашыстаў у іх логаве, у полк прыйшла радасная вестка: Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Уладзіміру Міхайлавічу Харытонаву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Сціпла, па-франтавому адзначылі авіятары гэтую знамянальную падзею. Некалі было святкаваць, баі ішлі жорсткія.

З таго часу мінула 15 год. Разыйшліся шляхі-дарогі франтавых сяброў Уладзіміра Харытонава.

Усе пасляваенныя гады лётчык Харытонаў удасканальвае сваю баявую вывучку. Багаты франтавы вопыт дапамагае яму ўмела выхоўваць паветраных байцоў, якія нясуць сваю ганаровую вахту ў небе Беларусі.

Г. СІБІРАКОЎ.

АБ'ЯВА

Беларускае аддзяленне Літфонду СССР з 1 чэрвеня 1960 года прадае пуцёўкі ў Дом творчасці імя Якуба Коласа (Каралішчавічы). Кошт пуцёўкі: пісьменнікам 1000 руб., дзецям пісьменнікаў да 14 год — 700 руб., не пісьменнікам — 1300 руб., дзецям да 14 год — 1000 руб.

Заяўкі падаваць у Беллітфонд, г. Мінск, Захарава, 19, тэлефон 3-22-04.

Галоўны рэдактар Янка ШАРАХОЎСКІ.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Аляксандр БУТАКОЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Аркадзь МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), Пятро ПРЫХОДЗЬКА, Раман САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), Мікола ТКАЧОЎ, Іван ШАЦІЛА, Рыгор ШЫРМА.

«Литература и искусство»—орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара —3-20-01, адказнага сакратара і аддзела літаратуры—3-25-25, аддзела мастацтва—3-24-62, аддзела культуры—3-21-53, выдавецтва —3-19-52, бухгалтэрыі —3-11-03.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у сераду і суботу.

АТ 08358

Друкарня імя Сталіна